ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 34-ы
№ 51 (2000)
25 чэрвеня 1965 г.
ПЯТНІЦА
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

НА РУБЯЖАХ СЯМІГОДКІ



ШЫРОКІЯ КРОКІ

ВЫШЫНЯ... Хто з гэтых хлопцаў не марыў аб ёй! З дзяцінства расло жаданне: вось узняцца б над зямлёй, агледзець зверху яе цудоўныя краявіды, бязмежныя далягляды, велічную архітэктуру гарадскіх ансамбляў. Гэтая прага і вызначыла іх прафесію: Аляксандр Прахін і Уладзімір Постнікаў сталі мантажнікамі-верхалазамі. Працуюць яны ў адной брыгадзе, якую ўзначальвае Аляксандр. Усе хлопцы ў брыгадзе з вялікім працоўным стажам, яны ўдзельнічалі многіх будоўляў, у тым ліку — Гродзенскага азотнатукавага завода. Цяпер мантажнікі заняты на будаўніцтве Гомельскага суперфасфатнага. Гэты завод — ударная будоўля вялікай хіміі рэспублікі. Першая яго чарга — серганіслая вытворчасць уступіць у строй да канца гэтага года.

Шырокія кроні беларускай сямігодкі! Гэтымі днямі стала вядома, што прамысловасць рэспублікі выканала сямігадовы план. Датэрмінова, амаль на восем месяцаў раней вызначанага тэрміну! Вось ён — размах нашай работы, гіганцкі плён працы савецкіх людзей, натхнёных велічнымі прадвызначэннямі ленінскай Праграмы нашай партыі.

Мы з радасцю даведаліся, што аб'ём прамысловай вытворчасці ў параўнанні з 1958 годам вырас у рэспубліцы больш чым у два разы пры заданні на сем гадоў у 1.8 раза. З пачатку сямігодкі выпушчана звыш прадугледжанай кантрольнымі лічбамі прамысловай прадукцыі больш чым на тры мільярды рублёў. Гэта азначае дзесяткі тысяч трактараў, сельскагаспадарчых машын, прыбораў, сотні тысяч тэлевізараў, тысячы грузавікоў, мільёны пар абутку, метраў тканіны і іншых вырабаў прамысловасці.

За гады сямігодкі ў рэспубліцы створаны новыя, невядомыя тут раней галіны прамысловасці: электронная і радыёэлектронная, нафтаперапрацоўчая, мінеральных угнаенняў, бавоўняная.

На бяскрайніх прасторах Беларусі задымілі трубы, выраслі сілуэты новых заводаў, фабрык, камбінатаў. Сярод іх Салігорскі калійны камбінат, Полацкі нафтаперапрацоўчы, Гродзенскі азотнатукавы, Мінскі маторны, Жодзінскі аўтамабільны заводы, першыя чэргі Баранавіцкага бавоўнянага камбіната і Светлагорскага завода штучнага валакна — усяго трыста новых буйных прадпрыемстваў і цахаў.

Цяпер кожны трэці цэнтнер калійных угнаенняў, кожны восьмы станок, кожны пяты трактар, шосты матацыкл, шаснаццаты аўтамабіль, трынаццаты радыёпрыёмнік і тэлевізар з тых, што выпускаюцца ў краіне, — наш, беларускі.

Беларусь як эканамічна развітая дзяржава ўпэўнена выходзіць на сусветную арэну. За шэсць гадоў сямігодкі падвоіўся і дасягнуў сямідзесяці ліх замежных краін, якія з ахвотай купляюць нашы беларускія тавары. Трывалае месца завадзвалі на сусветным рынку трактары «Беларусь», якія пастаўляюцца зараз у 24 краіны. Расце за мяжой цікавасць і да беларускага калія — рэспубліка ўжо цяпер выпускае мінеральных угнаенняў больш, чым у многіх найбольш развітых краінах.

Велічны, радасны фініш сямігодкі... Ён сведчыць, што далягляд, азораны агнямі камунізма, з кожным днём робіцца ўсё бліжэй і бліжэй.

Фота М. МІХАЙЛАВА.

АД КАМІТЭТА ПА ЛЕНІНСКІХ ПРЭМІЯХ У ГАЛІНЕ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА

Камітэт па Ленінскіх прэміях у галіне літаратуры і мастацтва пачаў прыём работ на атрыманне Ленінскіх прэмій 1966 года.

На атрыманне Ленінскіх прэмій 1966 года могуць вылучацца творы літаратуры, мастацтва, журналістыкі і публіцыстыкі, надрукаваныя, публічна паказаныя ці выкананыя не пазней 15 чэрвеня 1965 года.

Вылучэнне работ на Ленінскія прэміі праводзіцца кіруючымі органамі творчых саюзаў і рэспубліканскіх тэатральных таварыстваў, Прэзідыумам ВЦСПС, калегіямі міністэрстваў і дзяржаўных камітэтаў СССР і саюзных рэспублік, Акадэміяй мастацтваў СССР, вучонымі саветамі навукова-даследчых інстытутаў і вышэйшых навучальных устаноў, рэдкалегіямі газет і часопісаў на іх пашыраных пасяджэннях, а таксама сходамі працоўных.

Прыём работ будзе праводзіцца да 30 лістапада 1965 года.

Прапановы аб прысуджэнні Ленінскіх прэмій, водгукі аб вылучаемых творах, а таксама ўсе пытанні, звязаныя з афармленнем матэрыялаў, трэба накіроўваць па адрасу: Масква, І-51, Няглінная вул., 15. Камітэт па Ленінскіх прэміях у галіне літаратуры і мастацтва пры Савеце Міністраў СССР.

Народнаму паэту Беларусі ПЕТРУСЮ БРОЎКУ 60 ГАДОЎ



СЛОВЫ ПРЫЗНАННЯ І ЛЮБВІ

Праўленне Саюза пісьменнікаў СССР звярнулася да Петруся Броўкі з наступным прывітаннем:

«Дарагі наш брат і друг Пётр Усцінавіч!

Горача, ад усяго сэрца віншуем Вас, слаўнага сына беларускага народа, выдатнага савецкага паэта, віднага грамадскага дзеяча з днём шасцідзесяцігоддзя.

Каля сарака год аддана і натхнёна працуеце Вы на ніве беларускай літаратуры. Сабраны Вамі ўраджай — багаты і слаўны. Ён прыкметным і магутным патокам уліваецца ў агульнае рэчышча нашай многанацыянальнай савецкай літаратуры. Мільёны чытачоў удзячныя Вам за цудоўныя вершы і паэмы, якія ўвабралі ў сябе векавыя багацці народнай творчасці, народнага духу, увасобілі непаўторныя фарбы беларускіх палёў і лясоў, сіняву родных азёр і рэк. Ваша паэзія, а таксама і проза моцныя высокай грамадзянскасцю і раваліцыйным пафасам, адухоўлены тонкім, непадробным лірызмам.

З самага пачатку літаратурнага шляху Вы крочыце ў нагу з народам, памагаеце яму будаваць новае жыццё. На гэтым шляху Вы знайшлі прызнанне свайго шчодрага яркага таленту, Вашай вялікай грамадскай актыўнасці. Лаўрэат Ленінскай прэміі, народны паэт Беларусі, дэпутат Вярхоўнага Савета СССР — усё гэта выказвае любоў і высокі давер народа да свайго паэта.

Мы ведаем Вас як страснага песняра дружбы народаў, актыўнага барацьбіта за мір на зямлі супраць падпальшчыкаў вайны. Мы ганарымся Вамі і радуемся таму, што Вашы творы перайшлі рубяжы Радзімы і гучаць далёка за яе межамі.

У дзень Вашага слаўнага юбілею мы, сябры і таварышы па пяру, моцна абдымаем Вас і ад усяго сэрца жадаем Вам многа здароўя, радасцей, шчасця, жадаем новых і новых творчых здзяйсненняў на карысць савецкай літаратуры, якая сцвярджае высокія камуністычныя ідэалы.

З самымі добрымі пачуццямі і сардэчнымі пажаданнямі!»

□

Са шчырымі словамі прывітання звярнуліся да юбіляра беларускія пісьменнікі, пісьменнікі братніх рэспублік, шматлікія чытачы паэта.

Рэдакцыя газеты «Літаратура і мастацтва» таксама горача віншуе юбіляра і жадае яму ўсяго найлепшага ў жыцці, творчасці, грамадскай дзейнасці.

ПАРК ЦІ БУДАЎНІЧАЯ ПЛЯЦОЎКА?

МАГУТНАЕ дрэва захісталася, зялёная яго вершаліна дробна закалацілася і раптам імкліва пайшла ўніз.

— Сце-ра-жыся!

Яшчэ некалькі дрэў са стогнам ляглі побач...

Гэта адбываецца не ў далёкім лесапрамгасе, дарагі чытач, а ў цэнтры Мінска, сякера свішча не ў пушчанскім гушчары, а на людных берагах Свіслачы. Тут, каля дзіцячага парку імя Горкага, выкладаецца плітамі бераг, і рабочыя валяць паўвекавыя ліпы і таполі.

— Вайну перажылі, — уздыхае побач са мной старая жанчына, — а цяпер вось не ўцалелі...

— Нічога вы, бабуля, не разумееце, — кідае ёй малады рабочы, які абсякае сучча на паваленых дрэвах, — мы ж іх знішчаем, каб упарадкаваць парк!

„ЗНІШЧАЕМ, каб упарадкаваць...“ Гэтыя словы я зноў пачуў, калі пазваніў архітэктару Л. Усавай, аўтару праекта рэканструкцыі парку імя Горкага.

— Хай нам яшчэ дзякуй скажуць, — нібы пахваліла сябе Любоў Дэмітраўна. — Тут па праекце шырыня Свіслачы павінна быць сорак метраў, а мы пакідаем дваццаць пяць. Што датычыць дрэў, дык не турбуйцеся, пасадзім маладыя...

Што гэта за праект, па якіх мяняюцца берагі Свіслачы, валяцца пад корань паўвекавыя дрэвы і замест іх збіраюцца садзіць новыя?

...У 1960 годзе выканком Мінскага гарадскога Савета прыняў рашэнне ператварыць парк культуры і адпачынку імя Горкага ў дзіцячы. Стары парк не падыходзіў дзецям, і выканком звярнуўся да «Мінскпраекта» з просьбай распрацаваць праект новага комплексу адпачынку.

Тут, дарагі чытач, я вымушан перапыніць апавяданне, каб спытаць цябе, за які ты адпачынак — актыўны ці пасіўны? Май на ўвазе, проста адпачынак мяне не цікавіць, толькі «актыўны» або толькі «пасіўны». Што, язык не паварочваецца вымавіць гэтае не зусім дадатнае «пасіўны»? У тым вось і справа! Зрэшты, не турбуйся, за цябе ў свой час усё вырашыла Упраўленне культуры Мінскага гарадскога Савета.

Мы будуем новы парк, парашылі таварышы з упраўлення, дык ніякіх слядоў ад старога не павінна застацца. Хай усё будзе поўнай процілегласцю таму, што было. Толькі не ціхі, толькі актыўны адпачынак! Ніякіх пенсіянераў!..

Трэба аддаць належнае работнікам «Мінскпраекта». Яны і не падумалі астудзіць гарачыя галовы заказчыкаў. Новы парк, значыць новая канструктыўная задача. І быў распрацаваны такі праект, які ў сне нікому не сніўся. Праўда, пра адно забыліся архітэктары — што новы парк закладваецца не на голым месцы...

ЗДАЎНА зялёны масіў на ўзгорку над Свіслаччу ўпрыгожваў горад. Ішлі гады, Мінск рос і стары парк над ракой паступова абрастаў «малодшымі братамі». Парк Горкага, парк Купалы, парк Марата Казея, сквер на Цэнтральнай плошчы — у цэнтры горада з гадамі ўзнік цэлы зялёны раён. Цяжка ўявіць сабе сёння нашу сталіцу без гэтага яе жывога ўбрання.

І вось свішчуць сякеры, вішчаць пілы, валяцца векавыя таполі...

Калі б толькі адзіная гэта ахвяра была прынесена ў даніну імпэту добраўпарадкавальнікаў. Прайдзіся па парадзелых алеях парку імя Горкага, па незлічоных яго сцежках, дарагі чытач, звярні ўвагу, колькі там пнёў. І не старых, струхнелых (паміраюць і дрэвы), а маладых, ад зусім нядаўна спілаваных соснаў, ліп, таполяў. А іншыя следы вымірання?

Вось апаленая агнём бяроза — паблізу быў пажар. Вось клёны з аблупленай карой, а вось цэлы сад, на кожным дрэве якога лісце можна пералічыць па пальцах.

Цяжкае ўражанне пакідае сёння парк. Ён больш нагадвае будаўнічую пляцоўку, чым месца адпачынку.

— Я, калі студэнткай была, тут на лыжах хадзіла, — расказвае інжынер-азеляняльнік парку Надзея Іванаўна Фёдарава. — А цяпер у нас хоць светафоры стаў.

Надзея Іванаўна, бадай, не перабольшвае. Аўтамашыны па парку, праўда, пакуль што не ходзяць (хоць спецыяльная аўтатраса і будуецца), але што датычыць іншых збудаванняў, дык людскі паток, сапраўды, хутка трэба будзе рэгуліраваць светафорамі.

— За пяць гадоў, — дае даведку дырэктар парку Мікалай Сцяпанавіч Церахаў, — у нас пабудаваны атракцыёны «Кола агляду», «Віражныя самалёты», «Пятля Несцерава», «Народныя арэлі», «Дзіцячыя арэлі», «Ланцуговы калаўрот», «Дзіцячы калаўрот», «Ракетаплан», «Горка». Вядзецца будаўніцтва спартыўнага павільёна з гімнастычнай залай, велатрэку, кафэ-марожанага. У бліжэйшы час пачнецца будаўніцтва плавальнага басейна, павільёна дзіцячай цацкі, зімовага кафэ, павільёна штучнага лёду, бібліятэкі, выставачнай залы з чытальняй, пакоя смеху, пнеўматычнага ціру, яшчэ аднаго спартыўнага павільёна, зялёнага тэатра, электрападстанцыі...

— Як вы думаеце, — перабіваю я дырэктара, — ці не занадта многа для аднаго парку?

Мікалай Іванавіч кідае сумны погляд на праект, што вісіць у яго на сцяне.

— Калі б гэтым усё скончылася, — уздыхае ён, — а то ж канца і краю няма.

— Майце на ўвазе, — уключаецца ў гаворку Надзея Фёдарава, — кожнае збудаванне ў парку — гэта своеасаблівы айсберг. Вы бачыце толькі адну чвэрць, а тры чвэрці — падмурак, падземныя камунікацыі схаваны глыбока пад зямлёй. Асвятлення, вады, каналізацыі, цяпла патрабуе амаль кожны паркавы аб'ект, гэта безліч траншэй, а дрэвам яны нясуць гібель.

— Увосень, — расказвае Мікалай Сцяпанавіч, — рамонтнабудаўнічы ўчастак № 1 будтрэста гарсавета пракладваў цеплатрасу да планетарыя. Ужо тады было прынята рашэнне аб рамонце адміністрацыйнага корпуса. Я прасіў падвесці трасу і да яго. «Усё ў свой час», — адказалі мне ў трэсце. Цяпер зноў пачнуць раскопваць старыя траншэі. А на гэтым месцы дрэвы і так ледзь трымаюцца. Думаеце, адзіны такі выпадак? Не. Летась «Міндарбуд» вёў кабель да ракетаплана. Побач — аўтатраса і пляцоўка для павільёна дзіцячай цацкі. Ток патрэбны і ім. Праклалі б усё адразу. Дык спачатку паклалі кабель да атракцыёна, цяпер будуць пракладваць да аўтатрасы, а потым возьмуцца за павільён. Зямлю перакопваюць, як у скрынцы з пяском для дзіцячых гульняў, дзе ж тут жывому парастку выжыць?!

Нялёгка даводзіцца Мікалаю Сцяпанавічу. Гаспадарка ў яго вялікая, правоў жа — амаль ніякіх. Не дзіва, што на гэтай пасадзе ніхто доўга і не затрымліваецца. Мікалай Сцяпанавіч, напрыклад, семнаццаты па ліку дырэктар. Рук ён аднак не апускае.

— Восьваюем патроху, — усміхаецца ён. — Нядаўна дамагліся, што ў штат увялі інжынера-азеляняльніка.

Дзіва, але усе пяць гадоў дзіцячы парк імя Горкага абыходзіўся без спецыяліста па зялёным будаўніцтве. Парк раскінуты на тэрыторыі ў 29 гектараў, а доглядам дрэў тут былі заняты толькі чатыры чалавекі, дый і то тры з іх працавалі па сумяшчэнню.

— На жаль, не лепш складваюцца справы і цяпер, — гаворыць Мікалай Сцяпанавіч. — Чамусьці ў нашых рабочых акладах значна меншыя, чым у гарадскім трэсце зялёнага будаўніцтва. Каб даглядаць парк, патрэбна тэхніка, а ў нас яе амаль няма. І парку неабходна свая палівальна-ўборачная машына, машыны па догляду зеляніны, самазвал для падвозкі чарназёму і ўгнаенняў. У каштарысе ж Міністэрства культуры не прадугледжаны не толькі машыны, нават сродкі на набыццё насення траў.

ТУТ варта сказаць некалькі слоў пра гаспадароў і кватарантаў парку.

Што парк — «установа», «асяродак» культуры — ясна кожнаму. Відаць, па гэтай прычыне ўсёй яго тэрыторыяй і валодае Мінскае гарадское Упраўленне культуры. Але ж парк — гэта і зялёны масіў, эстэтычны раён сталіцы. Хто нясе адказнасць за яго захаванне? Міністэрству культуры, як гэта відаць, не пад сілу не толькі ўтрыманне, але, што больш важней, аднаўленне зялёнага фонду. Такая задача па сіле толькі спецыяльнай арганізацыі — трэсту зялёнага будаўніцтва. Мінскі ж Зяленбуд мае да парку толькі ўскосныя адносіны. На яго ўтрыманні знаходзяцца парк Янкі Купалы і парк Марата Казея, паркі, дзе няма «асяродкаў культуры». Што ж датычыць паркаў Горкага і Чэлюскінцаў, дык Зяленбуд выступае ў адносінах да іх у якасці шэфа. Да чаго прывяло гэта шэфства, мы бачылі на прыкладзе парку імя Горкага.

У парку няма сапраўднага гаспадара, але затое ёсць нямала кватарантаў. Толькі што пабудаваны планетарый, напрыклад, належыць таварыству «Веды». Кафэ «Марожанае» і зімовае кафэ будуе трэст сталовых і рэстаранаў. Гаспадар страляковага ціра — Добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту (у сімфонію шумаў паркавых атракцыёнаў цір уносіць свой уклад — рэзкія гукі стрэлаў). Нарэшце, кінатэатрам «Летні», які знаходзіцца на тэрыторыі парку, распараджаецца гарадскі аддзел кінафікацыі.

— Ці ўлічваліся ўсе гэтыя акалічнасці, калі складаўся план рэканструкцыі парку? — пытаемся мы ў Любові Дэмітраўны Усавай.

— Архітэктары сваю задачу вырашалі згодна з пажаданнем заказчыка, — адказвае Любоў Дэмітраўна. — Што ж датычыць зялёнага масіву, дык адначасова з праектам быў складзены дадатковы план азеляненння.

Істотны дадатак! Але выяўляецца, што за пяць гадоў план выкананы менш чым на дваццаць працэнтаў.

Мне давялося бачыць на месцы тыя «дваццаць працэнтаў», пра якія гаворыць Любоў Дэмітраўна, — чэзлыя, танклявыя саджанцы, палова з якіх ужо высахла, а палова трывае ледзь-ледзь. Калі ўлічыць, што дадатак да праекта складаўся пяць гадоў назад (у парку тады не было яшчэ ніякага будаўніцтва), стане канчаткова ясна, што ўяўляюць сабой «плановыя» дваццаць працэнтаў.

ШТО МОЖНА, што не позна, што трэба неадкладна зрабіць, каб выратаваць парк імя Горкага?

Перш за ўсё трэба перагледзець праект, складзены ў «Мінскпраекце». Можа ён і неблагі, але наўрад ці трэба параўнальна невялікую тэрыторыю парку насычаць такой колькасцю збудаванняў. Арыентацыя работнікаў гарадскога Упраўлення культуры на задавальненне патрэб «усіх без выключэння ўзростаў» (у парку ёсць, напрыклад, атракцыёны, разлічаныя толькі на дарослых) яўна не вытрымлівае крытыкі. Незразумела, чаму патрэбны парку велатрэк, цір і іншыя збудаванні стадыёнага тыпу.

Пакуль не будзе перагледжаны праект, у парку павінна быць спынена закладка новых аб'ектаў. Ад будаўнічых арганізацый трэба патрабаваць хутчэйшага завяршэння работ, якія ўжо вядуцца. Зразумела, на гэты раз праект рэканструкцыі парку неабходна абмеркаваць разам з прадстаўнікамі шырокіх колаў грамадскасці.

Ясна, што зялёная гаспадарка парку можа мець толькі аднаго гаспадара — трэст зялёнага будаўніцтва. Толькі трэст можа забяспечыць аднаўленне парку пасля пяці гадоў гаспадарання ў ім заўзятых прыхільнікаў «актыўнага адпачынку». Усе адносіны з трэстам арганізацый, якія выкарыстоўваюць парк, павінны рэгуляваць строга дагаворанымі абавязацельствамі.

Сярод шматлікіх гурткоў, якія працуюць у парку, няма аднаго — гуртка юных сяброў прыроды. Важным напрамкам у рабоце дзіцячага парку ў далейшым, відаць, павінна стаць выхаванне ў дзяцей любві да зялёнага сябра. Хай у парку паявіцца свой «зялёны патруль», свае юныя батанікі, біёлагі, натуралісты. Хай у гэтым акажуць дапамогу парку Камітэт па ахове прыроды, органы народнай асветы, шэфы.

Нельга далей не заўважаць, што парк імя Горкага — камунікатыўны, што яго штодзённа перасякаюць ва ўсіх напрамках сотні людзей. Далейшае павелічэнне сцежак пагражае парку поўным агаленнем касагораў, знішчэннем травянога покрыва. Неадкладна трэба пракласці дадатковыя алейкі там, дзе гэта неабходна для скарачэння шляхоў, увесці пешаходныя патокі ў асфальтаванае рэчышча.

І — апошняе. Таварышам з Упраўлення культуры час перастаць баяцца цішыні. Далібог, цішыня, «пасіўны адпачынак» — гэта таксама адпачынак, карысны і дзецям, таварышы з Упраўлення культуры. І лічыце захаванне дзіцячага парку адной з галоўных сваіх задач, за гэта і сучаснікі і нашчадкі нашы скажуць вам дзякуй.

Л. МАКСІМАЎ.

АДСТАІМ МІР!

РЭЗАЛЮЦЫЯ УСЕСАЮЗНАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ПРАДСТАЎНІКОЎ САВЕЦКАЙ ГРАМАДСКАСЦІ

Прадстаўнікі савецкай грамадскасці, што сустрэліся на Усесаюзнай канферэнцыі ў Маскве, прынялі рэзалюцыю, у якой аднадушна падтрымліваюць скліканне Сусветнага кангрэсу за мір, нацыянальную незалежнасць і раззбраенне.

Свет апынуўся цяпер перад наяўнасцю міжнароднай напружанасці, якая ўзмацнілася, і народы розных кантынентаў з вялікай вастрынёй адчуваюць пагрозу сваёй бяспецы, гаворыцца ў рэзалюцыі. У наяўнасці адкрытыя правакацыі і агрэсія супраць нацыянальна-вызваленчага руху, напад на сацыялістычную ДРВ. Сёння ўсе народы могуць сваімі вачыма пераканацца, хто праводзіць небяспечны курс нагнятання ваеннай пагрозы. Гэта, перш за ўсё, амерыканскі імперыялізм, які выступае ў ролі сусветнага жандара.

У рашучай падтрымцы справядлівай барацьбы в'етнамскага народа за свабоду і незалежнасць усе міралюбівыя сілы закліканы памножыць свае выступленні за хутчэйшы вывад амерыканскіх войск з Паўднёвага В'етнама, спыненне бамбардзіровак тэрыторыі Дэмакратычнай Рэспублікі В'етнам. Удзельнікі канферэнцыі рашуча патрабуюць спынення агрэсіі ЗША ў Дамініканскай Рэспубліцы, выказваюць брацкую салідарнасць і падтрымку гераічнаму кубінскаму народу і асуджаюць правакацыі імперыялістаў ЗША супраць рэвалюцыйнай Кубы, падтрымліваюць мужную барацьбу народаў Конга, Анголы, Мазамбіка, «партугальскай» Гвінеі, Паўднёвай Аравіі, якія са зброяй у руках дабіваюцца свабоды і незалежнасці.

Ад імя мільёнаў працоўных Савецкага Саюза канферэнцыя даручае савецкай дэлегацыі на Сусветным кангрэсе ў Хельсінкі выступіць за аб'яднаныя, практычныя дзеянні міралюбівых і свабодалюбівых сіл, за стварэнне неадольнай перашкоды на шляху падпальшчыкаў вайны, за зрыў арганізуемых імі правакацый супраць усеагульнага міру. У гэтым сёння першачарговая, неадкладная задача барацьбы за мір.

На Еўрапейскім кантыненце, які быў галоўным тэатрам дзвюх спусташальных сусветных войнаў, павінен быць гарантаваны трывалы мір і створана надзейная сістэма бяспекі.

Дамаганні заходнегерманскіх рэваншыстаў ствараюць прамую пагрозу для ўсеагульнага міру. Таму савецкія людзі выступаюць за аб'яднанне дзеянняў усіх міралюбівых сіл супраць ядзернага ўзбройвання бундэсвера.

Савецкія людзі поўныя рашучасці крок за крокам дабівацца расшырэння барацьбы за спыненне гонкі ўзбраенняў, змяншэнне небяспекі ракетна-ядзернай вайны. Яны выступаюць за тое, каб усе ядзерныя дзяржавы ўрачыста, перад тварам усяго свету заявілі аб сваёй адмове ад выкарыстання ядзернай зброі.

Савецкія людзі пацвярджаюць сваю нязменную прыхільнасць да прынцыпаў мірнага суіснавання паміж дзяржавамі з розным сацыяльным ладам.

Няхай Сусветны кангрэс за мір, нацыянальную незалежнасць і раззбраенне, гаворыцца ў заключэнне рэзалюцыі, адкрые новую старонку ў расшырэнні і ва ўмацаванні вялікага руху сучаснасці — руху супраць пагрозы сусветнай знішчальнай вайны!

ТАСС.

АМАТАРСКІЯ КІНАСТУДЫІ ЧЫГУНАЧНІКАЎ

«Заслон а ўцы сёння» — так называецца адзін з кароткаметражных фільмаў, які выпушчаны аматарскай кінастудыяй Дома навукова-тэхнічнай інфармацыі і прапаганды Беларускай чыгункі. У фільме расказваецца аб працы, грамадскай дзейнасці, вучобе і адпачынку былых саратнікаў праслаўленага важака партызан Канстанціна Заслонава. Многія з іх і сёння працуюць у Аршанскім лакаматыўным дэпо.

На рахунку гэтай аматарскай кінастудыі ўжо каля дзесяці фільмаў. Іх праглядзелі дзесятні тысяч працаўнікоў. Кароткаметражныя фільмы «Тварцы новага», «Разведчыкі будучыні», «Капрон замест металу» дэманструюцца ў клубах, вагонах-клубах і тэхнічных кабінетах. Яны часта суправаджаюцца лекцыямі.

Другая аматарская кінастудыя — пры Доме культуры чыгуначнікаў станцыі Магілёў створана параўнальна нядаўна. Але і яна ўжо зняла некалькі змястоўных фільмаў, была ўдзельнікам і прызёрам рэспубліканскага агляду. А фільм «Бярозавы сок» удзельнічаў ва Усесаюзным аглядзе.

Цяпер аматарскія кінастудыі разгарнулі дзейсную падрыхтоўку да 50-годдзя Савецкай улады. Да слаўнай даты Вялікага Кастрычніка вырашана выпусціць кінафільм «Беларуская магістраль за 50 год».

Р. СЫРКІН.

Работнікі Мінскай кнігарні № 11 вывучаюць попыт пакупнікоў, задавальняюць іх запыты на мастацкую, педагагічную і грамадска-палітычную літаратуру. На гэтым здымку вы бачыце загадчыцу кніжнага аддзела магазіна А. Смольскую (справа) і прадаўца М. Петрову, якія падбіраюць літаратуру для продажу.

УКАЗ ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ПІСЬМЕННІКА БРОЎКІ П. У. ОРДЭНАМ ЛЕНІНА

За заслугі ў развіцці савецкай літаратуры і ў сувязі з шасцідзесяцігоддзем з дня нараджэння ўзнагародзіць пісьменніка Броўку Пятра Усцінавіча ордэнам Леніна.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
А. МІКАЯН.

Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР
М. ГЕАРГАДЗЕ.

24 чэрвеня 1965 г.
Масква. Крэмль.

Спектаклі нашых гасцей

СПРЭЧКА З АКЦЁРАМ ІКС

Як дзевяноста, калі не ўсе дзевяноста дзевяць працэнтаў гледачоў, я прыйшоў на спектакль «Сто чатыры старонкі пра каханне», не чытаўшы напярэдне п'есы. І дадам пачіж іншым — не маючы і ў думках пісаць пра свае ўражанні ў газеце.

Уяўляю, што сёй-той з глыбокадумных тэатральных крытыкаў пры гэтым прызнанні дакорліва паківае галавой. І хто-небудзь з удзельнікаў спектакля — таксама. Маўляў, дык чаго ж ты пішаш? Бо дзесяткі гадоў існуе непарушная традыцыя — рэцэнзія друкуецца для таго, каб сказаць тэатру, наколькі правільна зразумеў ён п'есу, наколькі супадаюць думка рэжысёра з думкай аўтара, акцэнты выканаўцаў з акцэнтамі, прапанаванымі ў п'есе, і г. д., і да т. п.

Не бяруся спрачацца — можа, так яно і трэба, так яно і лепш. Але давайце ўсё-такі не забывацца, што дзевяноста, калі не ўсе дзевяноста дзевяць працэнтаў гледачоў купляюць у касе білеты не для таго, каб вырашыць, удала ці няўдала ўвасобіў тэатр п'есу, а проста, каб убачыць нешта цікавае і павучальнае, пасмяяцца або паплакаць, надоўга або назаўсёды захаваць у сэрцы пасля закрыцця заслоны нешта вельмі важнае. Давайце не забывацца, што толькі адзін-адзіноткі працэнт гледачоў (і гэта гаворыцца зусім не ў дакор гледачам) у час спектакля схіляецца да вуха суседа са скрыўленымі вуснамі: «Ведаеш, я чытала ў часопісе «Театральная жизнь», што Дароніна ў гэтай сцэне зусім не такая...» Для астатніх драматургія, рэжысура і выкананне — непарушнае цэлае.

Дык вось — п'есу Э. Радзінскага «Сто чатыры старонкі пра каханне» я ведаю такой, якой убачыў, або, калі ўжо фарсануць прафесіянальнай мовай, прачытаў яе Гомельскі тэатр. І мне гэтая п'еса спадабалася. І я зразумеў, чаму так ахвотна звяртаюцца да яе тэатры.

Не так даўно я выпадкова пачуў, як адзін паважаны, таленавіты і вельмі разумны акцёр адгукнуўся пра гэтую п'есу не надта паблажліва: маўляў, соплі і цукар. Акцёр гэты — цвёрды прыхільнік у Арбузава — толькі «Таці», у Вішнеўскага — «Аптымістычнай трагедыі», у Карпейчука — «Платона Крэчата» і «Пагібелі эскадры». Словам, драматургію ён прызнае адно такую, якая грунтуецца на **вялікай грамадскай** думцы, на сутыкненні і канфлікце ідэй, разуменняў грамадзянскага абавязку, сацыяльных сіл. Усялякія ж пачуцці, каханне — гэта, так сказаць, гарнір.

Паўтараю, я тады не ведаў «Сто чатыры старонкі...» і не мог ні пагадзіцца, ні запярэчыць. Але няпер я ахвотна б з тым акцёрам паспрачаўся.

Вытокі драматургіі, да якой належыць і п'еса Э. Радзінскага, — у рэакцыі пратэсту. Пратэсту супраць хадульных, архіправільных і вохці як сумных герояў, якія пэўны час з'яўляліся адзіна дазволенымі для савецкай драматургіі, для савецкага тэатра. Як ні трубіла крытыка пра складанасць і цікавасць такіх герояў, былі яны атуляюча нецікавымі і спрошчанымі. І надакучылі гледачу — на сто гадоў уперад! Вось чаму з такой прыхільнасцю сустракае ён п'есы, дзе персанажы надзелены чалавечымі пачуццямі — як сілы, так і слабасці,— дзе галоўнаму герою зусім не абавязкова ўсё, без выключэння, разумець у сабе і вакол сябе, дзе каханне не абавязкова адпавядае апісанню гэтага пачуцця ў брашуры для няпоўнагадовых, дзе ідэя — не абавязкова прапісныя ісціны, укладзеныя ў жалезабетонны маналог.

Усё гэта ёсць і ў спектаклі гамяльчан. Як і ў п'есе Э. Радзінскага. Маецца на ўвазе паглыбленая цікавасць да ўнутранага чалавечага жыцця, складаныя, разумныя героі, лёгкасць (не аблегчанасць!), добры, не пабаюся ўжыць гэтае слова, сучасны гумар.

Вядома, можна ўявіць і больш вострую падкрэсленасць аўтарскай думкі (гэта, мабыць, дакор пастаноўшчыку Ю. Арыянскаму), і больш дасціпнае афармленне (гэта — мастаку М. Якаўлеву), і больш «важкіх», нягледзячы на сціпласць адпушчаных драматургам сродкаў, Уладзіка (Ю. Сямікаленаў) і Астрацову (М. Кузняцова). Але, як кожны мастацкі твор, самае правільнае судзіць спектакль па тым, што ў ім ёсць, а не па тым, чаго яму не хапае. А ёсць у ім — нямала.

Мабыць, ад таго, што найбольшая, на маю думку, удача ў спектаклі — Еўдакімаў, я ўспрыняў гомельскія «Сто чатыры старонкі...» як расказ пра паступовае (праз велізарную, беззваротную ўтрату ў жыцці) усведамленне гэтым таленавітым і разумным чалавекам нейкіх ясных, простых і ў той жа час вунь якіх складаных ісцін. Прастата, да якой прыходзіш вось так, праз пошукі, выпрабаванні, пакуты — гэта ўжо прастата мудрасці, самая каштоўная прастата і ў жыцці, і ў чалавечым характары, і ў творчасці.

Бадай, гомельскі Еўдакімаў (арт. Ул. Слаўкоў) трохі старэйшы і больш вопытны ў жыцці, чым можна было б уявіць яго паводле драматургічнага матэрыялу і чым, мабыць, паўстае ён перад гледачом у спектаклях па гэтай п'есе, пастаўленых іншымі тэатрамі. Але драма **такога** Еўдакімава можа якраз і глыбейшая, душэўнае ачышчэнне такога Еўдакімава ад драбнаты, ад паказнога цынізму, ад скепсісу можа якраз і каштоўнейшае, чым іншага.

Адзначаючы ў першую чаргу значнасць Еўдакімава, я зусім не маю на мэце ніяк прынізіць Наташу (М. Кукліна). Зноў жа ўзнікае заканамернае пытанне: ці магла б імкнена гэта Наташа выклікаць валаспад пачуццяў, які так многа даў Еўдакімаву? Згодзен, што дзе-небудзь у іншым тэатры гэтае пытанне ставіцца інакш — што прынесла Наташы каханне да Еўдакімава. Але для мяне яно ўзнікла так, і я лічу гэта толькі своеасаблівасцю спектакля, а не яго недахопам.

Задаўшы сабе такое пытанне, з чыстым сэрцам адказваеш на яго станоўча — гэтая Наташа, безумоўна, заслугоўвае вялікага і ачышчальнага кахання, пра якое напісана п'еса. Ёсць у ёй непасрэднасць, даверлівасць і натрабавальнасць шчырага, усеабдымнага пачуцця, адчуваецца глыбінная ўнутраная прыгажосць. Хочацца толькі сказаць, што спектакль выйграў бы ў маштабнасці, каб артыстцы ўдалося ўзбагаціць вобраз больш яскравай думкай.

Пераканаўчы ў спектаклі Фелікс (С. Каменскі). Балай, ёсць нават нешта трагічнае ў абліччы гэтага непазбўленага здольнасцей чалавека, якому занадта лёгка давалася ўсё ў жыцці, пакуль не надышла пара рабіць у гэтым жыцці нешта галоўнае, дзеля чаго і жывеш...

Я не ставіў сабе мэтай — ды гэта было б і саманадзейна з майго боку, паглядзеўшы спектакль адзін раз — аналізаваць работу кожнага выканаўцы. Я ўжо сказаў, што не збіраўся нічога пісаць і ніякіх паметак, як гэта належыць рэцэнзенту, у час спектакля не рабіў. Наладзіць тэатральнае таварыства падвядзенне вынікаў гастроляў, тады паслухаюцца таварышы з тэатра самага падрабязнага прафесіянальнага разбору. Мае ж нататкі — проста выказванне чалавека, які выйшаў пасля спектакля з нейкімі ўражаннямі, з нейкім роздумам.

Урэшце, абуджаць гэты роздум — і ёсць прызначэнне тэатра.

Уладзімір МЕХАЎ.

Тамара Астроўская працуе кінамеханікам у сталінскім кінатэатры «Мір». Яна дасканала ведае апаратуру. І фільмы, якія яна дэманструе, паказваюцца на высокім тэхнічным узроўні. Свой вопыт Тамара Астроўская перадае кінамеханікам, якія праходзяць практыку ў кінатэатры.

У САЛДАЦКІМ КЛУБЕ

На гэты раз тасцямі воінаў Беларускай ваеннай акругі былі члены літаратурнага аб'яднання пры рэдакцыі шматтыражнай газеты «Аўтазаводзец» і ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці Палаца культуры аўтамабілебудаўнікоў. Цёпла сустрэлі салдаты, сяржанты, афіцэры гасцей. Зала салдацкага клуба не магла ўмясціць усіх жадаючых папасці на гэтую цікавую сустрэчу.

Першым выступіў рэдактар шматтыражкі Я. Карповскі. Ён расказаў аб рабоце літаратурнага аб'яднання, пазнаёміў прысутных з творчасцю рабочых паэтаў і празаікаў, гаварыў аб вялікай дапамозе, якую аказваюць маладым аўтарам беларускія пісьменнікі.

Потым слова ўзяў адзін з актыўных членаў літаратурнага аб'яднання, ветэран Вялікай Айчыннай вайны Герой Савецкага Саюза Я. Вайруб. Ён расказаў аб рабоце над дакументальнымі аповесямі «Людзі ў бранi» і «Сядок», прачытаў урыўкі з твораў.

Цёпла прынялі воіны паэтаў фармоўшчыка ліцейнага цэха коўскага чыгуну Ул. Дарашэвіча і токара інструментальнага цэха Г. Літвіна, якія прачыталі свае вершы, прысвечаныя аўтамабілебудаўнікам.

Членаў літаратурнага аб'яднання змянілі на сцэне самадзейныя артысты Палаца культуры аўтазавода. Жаночы вакальны ансамбль выканаў папулярную песню Ул. Алоўнікава «Недзе ў пасёлку» на словы заводскага паэта К. Глайхенгауза. Тэхнолаг Л. Іванішына і М. Перэльман выканалі песню Ю. Семянякі «Чароцінка».

У канцэрце прынялі ўдзел самадзейныя артысты П. Андронаў, Н. Гарбунова, Н. Шэрамент, эстрадны аркестр. Яны выконвалі байкі Ул. Корбана, урыўкі з твораў В. Быкава, песні беларускіх і рускіх кампазітараў.

М. ІСАКАЎ.

БЕЗ СКІДАК НА ПЕРЫФЕРЫЮ

Выязджаючы ў Нароўлю ў камандзіроўку, я склаў прыблізны план: напісаць пра цяжкасці, з якімі сустракаюцца тут культасветработнікі, пра тых, хто працуе сёння ў клубах і бібліятэках, пра энтузіястаў-актывістаў і пра людзей, абыякавых да сваёй работы. Кожнае з гэтых пытанняў актуальнае і ў вялікім горадзе, і ў далёкім ад яго раёне.

Нароўля—далёкі раён. Зрэшты, паняцце гэтае стала цяпер адноснае. Самалёт ад Гомеля ляціць да Нароўлі трошкі больш за гадзіну, рэгулярна ходзяць аўтобусы ў Мазыр і па раёне, тэлевізійныя антэны ўзняліся над дахамі дамоў не толькі ў раённым цэнтры, але і ў большасці вёсак, электрычнасць даўно свеціць у дамах і на фермах.

Наважыўшыся спачатку назваць гэтую карэспандэнцыю «У далёкім раёне», я потым падумаў: але як, ж ён далёкі, калі людзі жывуць тут тымі ж клопатамі і марамі, што і ў вялікіх гарадах, і працуюць без усялякіх скідак на перыферыйнасць, калі яны ў курсе ўсіх спраў планеты, калі іх справамі занарыцца краіна.

Нароўлянскі раён — новы, ён створаны ў студзені сёлетняга года. Гэтым, дарэчы, і тлумачацца многія цяжкасці ў рабоце.

Я не здзівіўся б, калі б загадчыца раённага аддзела культуры А. Зелянко пачала размову са скаргаў на гэтыя цяжкасці. Але яна гаварыла пра іншае — пра сваіх таварышаў, пра планы, пра новыя формы работы. Яна добра ведае раён, яго спецыфіку і запатрабаванні, і, галоўнае, мне здаецца, — яна сама ўмее правяліць ініцыятыву, умее тактоўна ўказаць падначаленаму на памылку, памагчы парадаю і справай. Веды ў яе ёсць, вопыт прыйдзе (А. Зелянко па адукацыі педагог, загадвае аддзелам культуры з часу ўтварэння раёна).

Мне няцяжка было б знайсці заганы ў рабоце аддзела — А. Зелянко нічога не ўтойвала. Яна, мне здаецца, сама была рада падзяліцца сваімі сумненнямі і трывогамі.

У раёне сёння шэсцьдзесят устаноў культуры на 72 населеныя пункты. Трыццаць з іх — дзяржаўныя, трыццаць належаць калгасам і саўгасам. Астатнія дванаццаць вёсак (у асноўным, невялікіх) абслугоўваюцца перасоўнымі бібліятэкамі. Бліжэйшая перспектыва развіцця сеткі — заканчваецца будаўніцтва Вуглаўскага сельскага клуба, калгасных клубаў у Вярбовічах і Галоўчыцах. З улікам чырвоных куткоў у маленькіх (па 25—30 двароў) вёсках гэта зусім нядрэнна.

Бяда толькі ў тым, што многія з устаноў культуры працуюць далёка не на поўную сілу, а то і больш — знаходзяцца ў запусценні. Рамантуюць клубы рэдка, зімою тут холадна і няўтульна. У калгасных клубах і бібліятэках няма ніводнага работніка са спецыяльнай адукацыяй. Адсюль і цяжкасці, і раённы аддзел культуры сваімі сіламі нічога змяніць не можа. Сама А. Зелянко, інспектар аддзела А. Васіленка, работнікі раённага Дома культуры і раённай бібліятэкі амаль штодзённа бываюць у вёсках, але такія кароткатэрміновыя візіты не вельмі што даюць.

Выезды работнікаў аддзела, вядома, неабходныя, але трэба падумаць аб іх змесце і форме. У радзе раёнаў вобласці пачаў практыкавацца такі метад: у раённым цэнтры арганізуецца брыгада для дапамогі сельскім клубам, у якую ўваходзіць і мастак, і бібліятэкар, і масавік, і іншыя дасведчаныя людзі. Яны прыязджаюць на месца і памагаюць справаю. Такі вопыт ёсць, напрыклад, у суседнім Ельскім раёне.

Як усюды, праблемай нумар адзін з'яўляюцца ў Нароўлі кадры. Не ва ўсіх калгасных клубах і бібліятэках ёсць нават штатныя работнікі. Калгасы раёна пакуль яшчэ эканамічна слабыя, але некаторыя ўсё ж маглі б за свой кошт паслаць на вучобу чалавека на курсы пры абласным Доме народнай творчасці. Ва ўсякім разе, раён вельмі адчувае патрэбу ў спецыялістах, тут іх чакае непачаты край цікавай работы, і пры размеркаванні выпускнікоў курсаў і культасветвучылішчаў гэта трэба, вядома, улічыць.

У мяне склалася ўражанне пасля паездак па раёне, што работнікі аддзела культуры не зусім ясна ўяўляюць сабе свае задачы. Пакуль што яны змагаюцца за паказчыкі — за колькасць удзельнікаў, колькасць калектываў мастацкай самадзейнасці, колькасць чытачоў у бібліятэках. А час ужо зазірнуць глыбей. Сапраўдная творчая работа пачнецца тады, калі на чале клубаў стануць кваліфікаваныя людзі.

Я ўжо гаварыў — дапамога збоку неабходна. Але можна і трэба павышаць кваліфікацыю самім работнікам культасветустаноў шляхам навучання. У Нароўлянскім раёне завочнікаў можна пералічыць па пальцах адной рукі, хоць ва ўстановах культуры яшчэ ёсць работнікі з адукацыяй шасці-сямі класаў. Вось адзін з іх — А. Партыка, загадчык Красноўскай сельскай бібліятэкі. Нават вялікі стаж — ён працуе ўжо 14 гадоў — не памагае яму як след наладзіць работу. Слухалі яго на пасяджэнні савета раённага аддзела культуры, крытыкавалі, далі тэрмін на выпраўленне. Сумняваюся, ці паможа гэта. Нават пры выключнай добрасумленнасці сёння чалавек, які скончыў вельмі даўно шэсць класаў, не справіцца ў поўнай меры са складанай работай сельскага бібліятэкара. 14 гадоў А. Партыка працаваў, усе гэтыя гады яго крытыкавалі, а чаму ніхто не сказаў яму проста, шчыра: ведаў у цябе мала, таму і працуеш дрэнна. За гэты ж час ён мог скончыць і сярэднюю школу, і тэхнікум. Гэта памылка не толькі яго, але і кіраўнікоў, і яе не трэба паўтараць.

А. Зелянко гаворыць, што ў кожнай вёсцы раёна ёсць баяніст і ў той жа час марыць хоць бы аб дзесятку баяністаў. Агаворка? Не. Музыкантамі Палессе багата, баяністы-актывісты ёсць у кожным клубе. Але яны — трактарысты, паляводы, настаўнікі, заняты сваёй непасрэднай работай і ў лепшым выпадку іграюць толькі на танцах ды аглядах. А колькі штатных работнікаў культуры раёна ўмеюць іграць на якім-небудзь музычным інструменце? Зноў на пералік хапае пальцаў адной рукі. Гэта не можа не хваляваць.

Калі загадчык клуба ў вёсцы энергічны чалавек — гэта вельмі добра, але яшчэ лепш, калі ён яшчэ і баяніст.

Неацэнную дапамогу можа аказаць установам культуры на вёсцы правільна арганізаванае шэфства гарадскіх устаноў. Тут і бясплатны канцэрт, і падарунак у выглядзе кніг, плакатаў, стэндаў, і, самае галоўнае, вучоба кадраў. Многія гарадскія клубы маглі б запрасіць да сябе на месяц клубнага работніка перыферыі. Штодзённая сувязь з кваліфікаванымі спецыялістамі, наведванне рэпетыцый, кансультацыі ў мастака сталі б сапраўднай школай для сельскага работніка культуры і прынеслі б, думаю, большую карысць, чым дзесятак метадычных пісьмаў. Або наадварот — вопытнага работніка з горада паслаць на месяц у вёску. Трэба таксама часцей наладжваць семінары з практычным уклонам. Увогуле шэф — гэта не ганаровае званне, гэта — першы памочнік і дарадчык.

Пакуль жа шэфскую дапамогу ў Нароўлі разумеюць вельмі вузка. Кандытарская фабрыка «Чырвоны мазыранін» (бадай, буйнейшае прадпрыемства раёна) пасля Пленума ЦК КПСС стала шэфам аднаго калгаса. Дапамога — аднойчы, у час сяўбы, пазычылі бензіну... І ўсе.

Вось і даводзіцца пакуль загадчыкам клубаў спадзявацца толькі на свае сілы. І добра яшчэ, што на дапамогу ім прыйшла мясцовая інтэлігенцыя. Настаўнік Васіль Юшчанка арганізаваў у вёсцы Канатоп хор даярак, работніца саўгаса Ніна Фешчанка на грамадскіх асновах загадвае бібліятэкай у вёсцы Вепры, няма штатных работнікаў у Бярозаўцы і Майдане, а гурткі мастацкай самадзейнасці тут працуюць. Спяваюць у Нараўлянскім хоры настаўнікі школы-інтэрната, памагаюць раённаму Дому культуры настаўнікі сярэдняй школы. Але нават самыя лепшыя актывісты іншы раз аказваюцца бяссільныя—ляжыць у Галоўчыцах камплект духавых інструментаў, а аркестра няма, таму што няма кіраўніка.

Знаёмства з раёнам будзе далёка няпоўнае, калі не расказаць пра загадчыцу Вярбовіцкай бібліятэкі Кацярыну Прыходзька, якая так арганізавала работу, што сёння ў яе зоне кнігі чытаюць у кожным калгасным двары (а іх каля 800), энергічнага і стараннага Мікалая Ілляша з Галоўчыц — я быў у яго чысценькім клубе, бачыў любоўна аформленыя стэнды, чуў яго размову з намеснікам начальніка абласнога ўпраўлення культуры Д. Мурзо, размову двухбакова кваліфікаваную і зацікаўленую. Або — Мікалай Шорп, загадчык клуба ў Дзёрнавічах. Дарэчы, тут — доказ таго, што толькі кваліфікаваны чалавек можа правільна паставіць справу. Мікалай працуе нядаўна, але веды і навыкі, атрыманыя ў культасветвучылішчы, добра памагаюць яму.

— Такога б у кожную вёску,— марыць загадчыца аддзела культуры, гаворачы пра Мікалая Шорпа. І задумваецца.

Так, падумаць ёсць над чым. Сёння можна неяк зразумець і неразбярыху ў справаздачах, і адсутнасць моцных калектываў самадзейнасці — раён малады і работнікі маладыя. Заўтра гэтае апраўданне адпадзе.

Узнімаць культуру раёна трэба, відаць, пачынаючы з раённага цэнтра, каб вёскам было з каго браць прыклад, на каго раўняцца.

Моладзі ў Нароўлі шмат. Улетку ўсе ідуць у старажытны парк над ракою — тут танцавальная пляцоўка, зрэдку бываюць канцэрты. Зімою — у асноўным кіно і танцы ў Доме культуры. Зрэдку — вусныя часопісы ў бібліятэцы. У фае Дома культуры вісіць расклад заняткаў гурткоў — яны павінны праходзіць штодзённа. За чатыры дні, якія я правёў у Нароўлі, адбылася адна рэпетыцыя драматычнага гуртка ды праслухоўванне на скорую руку двух салістак да будучага канцэрта. Праўда, у гэтыя дні кіраўнікі выязджалі для дапамогі на вёсцы.

Кожная сарваная рэпетыцыя— гэта ўдар па аўтарытэту Дома культуры, гэта страта ўдзельнікаў. Гэта мінус у эстэтычным выхаванні. А ў гэтых адносінах трэба яшчэ многа зрабіць.

Можна ўсё спісаць на цяжкасці арганізацыйнага перыяду. Можна ўсяму знайсці апраўданне. Так робяць людзі абыякавыя. У Нароўлі ж я пазнаёміўся з самакрытычнымі, гарачымі ў справах і спрэчках людзьмі. Многае яны могуць выправіць самі, але дапамога ім патрэбна — неадкладная і дзелавая.

Д. РАДЗІНСКІ,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

БУКАВІНА МАЯ, БУКАВІНА

Значнае месца ў рэпертуары Чарнавіцкага музычна-драматычнага тэатра займаюць творы выдатнай украінскай пісьменніцы Вольгі Кабылянскай, чыім імем названы гэты тэатр. Інсцэніроўкі яе таленавітай аповесці «Зямля», народнай песні «У нядзелю рана зелле збірала» паклалі аснову так званага «Букавінскага летапісу». Сюды ж уваходзіць і напісаная артыстам Чарнавіцкага тэатра А. Ананьевым інсцэніроўка аповесці «Ваўчыха».

Праз усю творчасць В. Кабылянскай чырвонай ніткаю праходзіць тэма зямлі, больш правільна — вечнага смутку селяніна па зямлі.

Зямля! Палітая потам, любоўна апрацаваная мазольнай мужыцкай рукою, адзіная карміцелка... Малюсенькі надзел зямлі! Як многа ён значыў у мінулым для селяніна. На Букавіне зямельнае пытанне стаяла асабліва востра. З-за нястачы зямлі разбураліся сем'і, брат ішоў на брата, сын на бацьку... І разам з дажджом і сонцам зямля ўбірала кроплі крыві.

...Ля магілы бацькі стаіць на каленях жанчына. Бога яна кліча ў сведкі, клянецца, што выкупіць зямлю, якая пагнылула яе бацьку. Недаядаць, недасыпаць, ва ўсім адмаўляць сабе будзе, але яе дзеці будуць мець сваю зямлю!

З самага пачатку спектакля «Ваўчыха» яго гераіня Зоя Жмут (заслужаная артыстка УССР А. Янушэвіч) — сялянка, якая пражыла цяжкое, поўнае нягод жыццё. І жыццё пакінула ў яе душы горкія сляды. Круты нораў, падазронасць, эгаізм, уласніцтва моцна ўкараніліся ў характары Зоі Жмут. Скапіць грошы становіцца яе адзінай мэтай. Фанатызм яе не мае мяжы. Прытым злосць, падазронасць набываюць гіпербалічныя памеры. Пакутуюць блізкія—муж, сыны, дачка. Яны працуюць з раніцы да позняй ночы паўгалодныя. Жмуціха адмаўляецца выдаць сваю дачку Санду за каханага, таму што той бедны. Людзі назвалі Зою ваўчыхаю. Сын, родны сын Юрко кідае маці ў твар гэтую мянушку.

Памірае муж. На вайне гіне сын Якаў. Зоя выганяе з дому яго жонку з дзіцем. Юрко, другі сын, сам пакідае дом. Нават мяккая і пакладзістая Санда не вытрымлівае дэспатызму маці, пакідае яе і ідзе да каханага.

І вось мэта дасягнута — зямля выкуплена! Але з'яўляецца чыноўнік з сялянскага банка, рэквізуе дом і маёмасць за быццам не заплаканыя нябожчыкам бацькам Зоі прапэяты. Гора забіла яе. Яна падпальвае дом і гіне ў агні.

Створаны А. Янушэвіч вобраз Зоі — вялікая творчая ўдача ў спектаклі. Актрысе ўдалося «з'яднаць» у адным вобразе Ваўчыху-скапідома і Зою-чалавека.

Ці то А. Янушэвіч сама нарадзілася на Букавіне, ці то доўга і тонка назірала жыццё яе народа, але яна здолела знайсці столькі характэрных рысаў і рысачак, дакладных і нацыянальна своеасаблівых, якія ў спалучэнні з высокім акцёрскім майстэрствам ствараюць глыбокі і праўдзівы вобраз.

Лёс Зоі Жмут цесна звязаны з лёсам яе аднавяскоўцаў. І хоць дзеянне адбываецца ў адной сям'і, мы бачым і вёску, у якой жыве сям'я Зоі, і сотні іншых вёсак тагачаснай Букавіны. Прыгожыя там жывуць людзі. У іх свае звычаі, нораўы. І хоць жыццё цяжкое, але яно ідзе сваёй чаргой. Людзі працуюць, кахаюць, нараджаюць дзяцей, спяваюць і водзяць карагоды... Пяшчотныя і чыстыя душы ў гэтых людзей, як у Санды, дачкі Зоі. І каханне ў яе такое ж чыстае, як крынічная вада, як песня, бясхітрасная, простая, душэўная. Спачатку мы бачым Санду (заслужаная артыстка УССР В. Зімняя) зусім яшчэ юнай дзяўчынай, сарамлівай, нясмелай, напоўненай жыццёвай неплынёй і святлом. Яна кахае такога ж простага хлопца Саўку (артыст П. Нікіцін). Вось Саўка ідзе на вайну. Санда чакае самаддана і доўга. Дзесьці расстралялі брата Якава, памёр бацька, даймае маці, прымушаючы выйсці замуж за нялюбага. І Санда становіцца дарослай. Жыццё паклала на яе адбітак. І да радасці (пасля вяртання Саўкі) прымешваецца горыч і крыўда за бясследна пражытыя гады.

Апроч тэмы зямлі, у гэтым спектаклі, набліжаючы яго да сённяшняга дня, раскрыта тэма вайны. Трэба сказаць, што зроблены рэжысёрам Е. Золатавай акцэнт на тэме вайны, хоць мае надзённае гучанне, трошкі перапыняе асноўную тэму зямлі. Гэта адбываецца на рытмічнай характарыстыцы спектакля.

У спектаклі шмат масавых сцэн, у ім занята шмат акцёраў. У кароткай рэцэнзіі цяжка гаварыць пра кожнага з іх, скажам толькі, што работа іх строга падпарадкавана рэжысёрскай задуме, якая дазваляе стварыць шырокі, шматпланавы спектакль.

У заключэнне трэба даць, што «Ваўчыха» на рэспубліканскім агляде лепшых спектакляў Украіны адзначана дыпломам 1-й ступені. Чарнавіцкі тэатр мяркуе паказаць сваю пастаноўку ў Крамлёўскім тэатры ў Маскве.

Віктар ЗАВІЗІЁН.

НАВІНЫ КУЛЬТУРНАГА ЖЫЦЦЯ

СТВАРАЕЦЦА НАРОДНЫ МУЗЕЙ

У Палацы культуры гомельскіх чыгуначнікаў пачалося стварэнне народнага музея. У яго экспазіцыі намечана шырока паказаць гераічнае мінулае, бавыя і працоўныя подзвігі чыгуначнікаў Гомельскага вузла і працоўных горада, барацьбу за здзяйсненне рашэнняў XX з'езда КПСС.

Райпрафсож Гомельскага аддзялення Беларускай чыгункі і праўленне Палаца культуры звярнуліся да чыгуначнікаў і ўсіх жыхароў горада з заклікам аказаць дапамогу ў зборы дакументаў, пісем, фотаздымкаў і іншых матэрыялаў, звязаных з гісторыяй чыгуначнага вузла і горада.

БЕЛАРУСЬ—ЛІТВА

З кожным годам умацоўваюцца братнія сувязі Беларусі і Літвы. Работнікі мастацтва дзвюх рэспублік абменьваюцца канцэртамі, арганізоўваюць літаратурныя вечары. Сёння Беларускае радыё і тэлебачанне праводзяць Дзень літоўскага радыё. Перад слухачамі нашай рэспублікі выступяць партыйныя і савецкія работнікі Літвы, творчыя калектывы, пісьменнікі, мастакі. Вялікі канцэрт будзе перадаваць Дзяржаўны народны ансамбль песні і танца Літвы. Заслужаны артыст Літоўскай ССР спявак Вігдаліюс Нарэйка выканае нацыянальныя песні. Аматары сімфанічнай музыкі пачуюць пазму «Мора» кампазітара М. Чурлёніса. На бланітным экране будзе транслявацца праграма Вільнюскай студыі тэлебачання — канцэрт майстроў мастацтва братняй рэспублікі, фільм-канцэрт «Звіні, песня Балтыкі» і інш.

МАЛАДАЯ ПРАФЕСІЯ

Тэлевізійны мастак — прафесія маладая. Яна яшчэ дасканала не асвоена, не вывучаны ўсе яе асаблівасці.

Таму многа цікавых пытанняў узнікла на семінары мастакоў, арганізаваным Мінскай студыяй тэлебачання. У ім прынялі таксама ўдзел мастакі абласных тэлестудый. Былі абмеркаваны пытанні дэкаратыўнага і графічнага афармлення тэлеперадач. У размове прынялі ўдзел рэжысёры Ул. Станкевіч, А. Гутковіч, мастакі В. Казлоў, М. Карпук, аператар Ул. Пранько.

ПА ЗАПРАШЭННЮ ПІНЧАН

Працоўныя Пінска запрасілі да сябе на гастролі Варонежскі рускі драматычны тэатр імя М. Г. Чарнышэўскага. Госці пачалі свае выступленні драмай «Драпежніца» Бальзака. У рэпертуары тэатра п'есы «Ад імя любві» А. Андрэева, «Бура ў шклянцы» І. Дварэцкага, «Яго кіраваць жонкай» Д. Флетчара і іншыя. За час гастроляў варонежцы пакажуць 15 спектакляў у Пінску і бліжэйшых раёнах.

У Дзяржаўны народны аркестр БССР прыйшлі маладыя артысты — выпускнікі Мінскага музычнага вучылішча імя М. Глінкі. Мастацкі кіраўнік аркестра І. Жыновіч гутарыць з маладымі цымбалістамі Л. Абрамовіч, Р. Доўкар, Л. Пінчук, Ф. Жыв і баяністам В. Казючыц.

Фота Ул. КРУКА.

У МАЙСТЭРНЯХ МАСТАКОЎ

І КНІГІ, І ЛІНАГРАВЮРЫ...

Бадай, іменна гэтымі словамі можна вызначыць у самых агульных рысах творчыя планы Валянціна Мікалаевіча Ціхановіча — мастака-графіка, мастака - карыкатурыста.

І ў апошніх нумарах «Вожыка» мы бачылі яго трапныя карыкатуры. Працуючы над імі, ён ужывае самыя разнастайныя прыёмы — ад акварэлі і гуашы, да аплікацыі.

На пытанне нашага карэспандэнта аб сваіх бліжэйшых творчых планах Валянцін Мікалаевіч адказаў:

— Паездка на Карэльскі перашыек... Літаральна праз тры-чатыры дні выеду... Навошта?.. Справа ў тым, што я задумаў серыю лінагравюр на тэмы, як кажуць, жывой прыроды. Вось і хачу паназіраць і жывёл, і птушак. І нават адлюстраванні ў вадзе... Я ж у асноўным, калі працую, карыстаюся зрокавай памяццю...

Апроч твораў станковай графікі, Валянцін Мікалаевіч мяркуе працягваць працу ў графіцы кніжнай.

— Да канца года пасцею аформіць адну-дзве кнігі, — кажа ён.

У асноўным Валянцін Мікалаевіч афармляе кнігі для дзяцей. Вось і нядаўна ім здадзена ў выдавецтва «Беларусь» афармленне кнігі вершаў для дзяцей Рыгора Барадуліна, якая неўзабаве павінна выйсці ў свет.

— Як і ва ўсякай дзіцячай кнізе, тут у асноўным такія ілюстрацыі, дзе галоўныя героі — дзеці, родная прырода... Вершы Рыгора Барадуліна — цікавыя, афармляць іх было вельмі прыемна. Нават шчыра давялося пашкадаваць, што некаторыя з гэтых вершаў не выходзяць асобным выданнем. Есць жа ў кнізе такія вершы, якія здольны даць самастойны «выяўленчы сюжэт» для цэлай кніжкі...

БУДЗЕ Ў ВЁСЦЫ ПРЫГАЖОСЦЬ

Неяк напрадвесні дэпутаты Удзелаўскага сельсавета Глыбоцкага раёна сабраліся на сваю сесію. Гаворка была не зусім звычайная,—пра культуру калгаснай вёскі. Гэта пытанне ў парадку дня сесіі Савета ўзнікла не выпадкова. На тэрыторыі сельсавета чатыры калгасы — імя Калініна, «За Радзіму», «Гігант» і імя Чапаева, кіраўнікі якіх, звярталі мала ўвагі на культуру вёскі.

Дэпутаты вырашылі абвясціць шырокі паход за прыгожую вёску і, у прыватнасці, арганізаваць будаўніцтва культурна-бытавых устаноў, стадыёнаў і спортпляцовак, азеляніць, упрыгожыць вуліцы. Для калгасаў, якія даб'юцца ў гэтай справе лепшых поспехаў, устанавілі пераходны Чырвоны сцяг выканкома сельскага Савета, а для населеных пунктаў— пераходны Чырвоны вымпел. Вынікі спаборніцтва вырашылі падводзіць два разы ў год.

Пасля сесіі ў кожным калгасе адбылося пашыранае пасяджэнне праўлення, а ў брыгадах—сходы. Працягвалася размова, пачатая дэпутатамі на сесіі.

Так калгасы Удзелаўскага сельсавета пачалі шырокі паход за культуру сваіх населеных пунктаў. Нядаўна мне давялося пабываць у некаторых з іх.

Вёска Удзела — цэнтр сядзібы сельскагаспадарчай арцелі «За Радзіму». Тут якраз адбываўся нядзельнік па добраўпарадкаванні вуліцы і двароў. На работу выйшлі і дарослыя, і вучні. Машына за машынай, нагружаныя шчэбнем, пяском, каменнем, пад'язджалі да месца работы. Тут я і застаў старшыню сельсавета Уладзіміра Рыгоравіча Маніна.

— Закладваем Алею шчасця, — тлумачыць мне Уладзімір Рыгоравіч. — Народзіцца ў каго-небудзь сын ці дачка, або маладыя людзі возьмуць шлюб, дык у памяць пра гэта пасадзім дрэўцы.

Я ехаў дарогай Лозічы — Міхальцы. Гэта, бадай, больш за тры кіламетры. І ўсюды — свежыя пасадкі.

У цэнтры вёскі Верхняе яшчэ нядаўна была гара. Лысай яе называлі. А цяпер яна ўся ў квяцістым убранні маладых яблынь, вішань, сліў, груш. Каля 60 гектараў тут заняла сады. Побач блакітнымі люстрамі ляжаць два штучныя возеры.

У Верхнім пабудавана двухпавярховая мураваная школа, лазня, некалькі шматкватэрных дамоў для калгаснікаў і спецыялістаў сельскай гаспадаркі. Будуецца Палац культуры калгаса. Ля яго будзе пастаўлены помнік-абеліск воінам, што загінулі ў баях за Радзіму.

Напрадвесні ў вёсцы адкрылася сталоўка. Праўленне арцелі адпускае для яе неабходныя прадукты. Многія хлебаробы карыстаюцца паслугамі сваёй сталоўкі.

А жыхары вёскі Мярэцкіх праклалі водаправод, паставілі на вуліцы 15 водаразборных калонак, праводзяць ваду і ў хаты калгаснікаў.

— Хутка не пазнаеце нашай вёскі, — гаворыць дэпутат сельсавета Віктар Лабачэўскі.

І сапраўды. Ля кожнага дома ўздоўж вуліцы адведзена паласа шырынёю ў сем метраў — для кветак, дрэў. 12 тысяч кустоў акацыі, 2600 дэкаратыўных і 1.200 фруктовых дрэў пасаджана тут. Кожны калгас на сваёй сядзібе будзе мець яблыні, грушы, слівы, вішні.

Шырокі паход за культуру калгаснай

Аб партыі думаю роднай, аб Леніне думаю я

Пятрусю Броўку

СЫН НАРОДА, ПЯСНЯР НАРОДА

Сяргей ГРАХОЎСКІ

Мы адзначаем шасцідзесятае лета народнага паэта рэспублікі, лаўрэата Ленінскай прэміі, вядомага грамадскага дзеяча, нашага старэйшага таварыша Петруся Броўкі.

Людзей, якія прайшлі больш за паўсотні нялёгкіх і слаўных дарог, юнакі цішком называюць «старымі». А па сутнасці, шэсць дзесяцігоддзяў— гэта поўдзень жыцця, калі толькі каласіцца і спее ўраджай на паэтычнай ніве, калі зерне становіцца тугім, а колас умалотным, калі яшчэ чуваць крокі ўласнай маладосці, а дарога кліча далёка, далёка. У такім узросце сапраўдны мастак заўсёды лічыць, што самага галоўнага і важнага ён яшчэ не сказаў, што самы лепшы твор яшчэ трэба напісаць.

За некалькі дзён да юбілею нашага добрага друга і старэйшага сабрата я доўга з ім гаварыў — гартаючы старонку за старонкай яго творы. Гутарыў я і з дваццацігадовым камсамольцам Петрусём Броўкам, і з баявым палітработнікам грозных гадоў Айчыннай вайны, і з сённешнім убеленым сівізной, умудроным жыццём, але па-ранейшаму неспакойным Петрусём Усцінавічам...

Звычайна гісторыкі літаратуры пачаткам творчага жыцця пісьменніка лічаць дзень апублікавання яго першага твора. Фармальна гэта так. А па сутнасці ўвесь папярэдні шлях, жыццёвы вопыт, першыя ўражанні за парогам бацькавай хаты, першыя радасці і трывогі на ўсё жыццё акамулююща ў душы мастака, спеюць у яго сэрцы, каб стаць натхнёнымі песнямі, якіх ён не можа не стварыць.

Зарыва першай рускай рэвалюцыі ахрысціла прыход паэта ў жыццё, а Кастрычнік 17-га года даў яму крылы для палёту, мужнасць і сілу, святую веру ў шчасце свайго народа, у роскві́т роднай зямлі. З першых свядомых дзён жыцця Пятрусь Броўка ўсяго сябе аддае рэвалюцыі, творчасцю сваёй імкнецца служыць народу, партыі, вялікім ідэям Леніна. Яго песня заўсёды наперадзе, яна ніколі не была ў абозе, ніколі не шукала зацішных і торных сцежак, яна клікала і вяла, вядзе і натхняе сягоння, будзе клікаць і весці заўтра.

Паэт ніколі не мае права быць раўнадушным і абыякавым, замкнёным у сабе, бяссграсным рэгістратарам падзей. Аляксандр Даўжэнка трапна сказаў: «Пісьменнік, калі ён піша, павінен адчуваць сябе роўным самаму высокаму палітычнаму дзеячу, а не вучню або прыказчыку».

Палітычным дзеячом, адказным за малое і вялікае, за сёння і заўтра, заўсёды сябе адчуваў і адчувае паэт Пятрусь Броўка. Шумелі «гады, як шторм», гучала страсная «Прамова фактамі», пачыналіся «цэхавыя будні» і паэт быў непахісны ў сваёй мабілізаванасці і адданасці сённяшняму дню, самым баявым і трапяткім падзеям часу. Няхай асобныя раннія творы былі патронамі, з якіх можна стрэліць толькі адзін раз, але яны білі без промаху па ворагу, салютавалі нашым перамогам.

Напярэдадні суровых народных выпрабаванняў Вялікай Айчыннай вайны Пятрусь Броўка стаў членам Ленінскай партыі, радавым гвардыі камуністаў. Калі ж «трывожна ўзняліся гудкі», паэт паклаў сваю запісную кніжку паміж патронаў і стаў у строй абаронцаў Радзімы. Праз папялішчы і чад вайны, праз смерць і страты франтавыя дарогі павялі яго на ўсход. Нібы агнявымі меткамі, яго муза адзначыла гэты шлях суровымі і мужнымі радкамі, поўнымі веры ў перамогу, у вызваленне роднага краю. З першых дзён вайны, калі палала і засцілалася дымам родная зямля, паэт заяваў вінтоўкаю і палымянымі радкамі сваіх мужных вершаў.

Пад вершамі першых дзён вайны стаяць паметкі: 1941, Клімавічы, Гомель, Бранск, Касторнае, Мічурынск, Масква... І цяпер, праз два з лішнім дзесяцігоддзі, гэтыя радкі — жывыя сведкі вайны — хвалююць кожнае чыстае сэрца; а тады яны грымелі гранатай, узвіваліся ракетай, якая паднімала байцоў на баі і подзвігі.

Вершы Петруся Броўкі ваеннай пары дакладней называць не цыкламі, не нізкамі, а гарачымі абоймамі, закладзенымі ў снайперскую вінтоўку. Варта толькі ўспомніць іх — «Партызанка», «Помста», «Кастусь Каліноўскі», «Палявая пошта», «Байцам-беларусам», «Паэма пра Смалячкова»,— каб адчуць і ацаніць творчую і грамадзянскую страснасць паэта. Вера ў перамогу, у вызваленне беларускай зямлі ад варожай навалы жыла заўсёды ў яго сэрцы. Усё часцей і часцей праз вогненныя рубяжы фронту думка паэта вярталася ў родныя мясціны, у памяці сэрца гучалі струны цымбалаў і гоманы бору, легенды і жніўныя песні, чутыя ў маленстве, а іх заглушаў хаўтурны плач і стогн заняволенага, але не скоранага народа.

Гераічны шлях нашага народа, яго шматвекавая гісторыя знайшлі ўвасабленне ў паэме «Беларусь». Яна зіхаціць усімі адценнямі харастваў роднай зямлі, то льецца шырокаю плынню народнага эпасу і вечна жывое песні, то гучыць у ёй суровы і страсны маналог вернага сына, паэта і воіна.

Калі яшчэ дымяліся вогнішчы на вызваленай беларускай зямлі, а полымя вайны кацілася на захад, Пятрусь Броўка ўжо заклікаў сваіх землякоў: «Возьмем сеўні, возьмем сеўні, час на поле нам выходзіць». Мара паэта стала здзейсненаю яваю.

Нельга нават пералічыць усяго, што напісаў Пятрусь Броўка ў пасляваенныя гады. У яго паэзіі заўсёды б'ецца пульс нашага часу, яго радуе першы пасляваенны «смачны хлеб працавіты» і тое, што на месцы апошняй зямлянкі ўздымаецца звонкі сасновы зруб, а на папялішчах гарадоў вырастаюць новыя камяніцы. У цэнтры ўвагі паэта заўсёды чалавек працы, майстра і мастак сваёй справы. Гэта аратыя і млынары, архітэктары і аграномы, будаўнікі і плытагоны, той каваль, што «выкуе месяц, як толькі захоча».

Паэту няма патрэбы вывучаць жыццё, ён жыве ім, і дыяпазон яго інтарэсаў, яго ўдзелу ў імклівых і бурных падзеях нашага часу надзвычай шырокі. Як дэпутат Вярхоўнага Савета СССР Пятрусь Броўка сустракаецца са сваімі выбаршчыкамі, дбае пра будаўніцтва новае школы, калгаснага клуба, клапоціцца пра пенсію для маці партызана. Ён выступае як барацьбіт за мір на сесіі Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, ездзіць на сваю родную Ушаччыну і ляціць за акіян, ён дапамагае малодшаму паэту парадай і падтрымкай, кіруе пісьменніцкай арганізацыяй, рэдагуе творы нашых класікаў, працы Інстытута літаратуры імя Я. Купалы. На ўсё ў яго хапае часу, энергіі, маладога запалу.

Мне ўспамінаецца мудрае выслоўе таджыкскага пісьменніка XI стагоддзя Кабуса: «Калі хочаш быць лепшым з людзей, нічога для іх не шкадуй». Пятрусь Броўка не шкадуе сябе для людзей. Яго дабрату і ўвагу адчувае кожны, каму патрэбна падтрымка і дапамога. Паэт прагны да жыцця, да ўсіх зямных радасцей. Зімою і летам яго рабочы дзень пачынаецца ў шэсць гадзін раніцы імклівай праходкай па яшчэ пустых вуліцах горада. І, мабыць, у гэты ранні час нараджаюцца новыя задумы, новыя радкі і вершы.

Пры ўсёй шырыні і шматграннасці партыйных, дзяржаўных, грамадскіх і звычайных чалавечых клопатаў і інтарэсаў Броўка, перш за ўсё, паэт, і, мабыць, з усіх нашых паэтаў самы працавіты і плённы. За сорак гадоў літаратурнай работы ў СССР выйшла 67 ягоных кніг тыражом 1 мільён 776 тысяч 500 экземпляраў. На беларускай мове выдадзена 37, на рускай 21 назва. Вершы Броўкі гучаць на мовах большасці народаў Савецкага Саюза, іх добра ведае і зарубежны чытач.

Наш старэйшы таварыш, народны паэт рэспублікі Пятрусь Броўка, перажывае пару мудрай сталасці. З кожным новым вершам расце яго майстэрства і не траціцца малады неспакой, страснасць і непасрэднасць. І гэта натуральна. Калі вымяраць узрост меркаю абхазскіх або дагестанскіх аксакалаў, дык узрост нашага юбіляра можна лічыць юначым, хоць гады, нягоды і праца густа пасерабрылі яго галаву і пакінулі глыбокія зморшчыны на чале. Сэрца паэта застаецца маладым, гарачым і добрым. Яно, як самы чулы сейсмограф, рэагуе на кожны штуршок на любым кантынеце і ў самым патайным куточку чалавечай душы. Паэт ведае цану шчасцю і жыве для шчасце людзей:

Ранкам я ўстану,
сонца сустрэну,
як выблісне з бору—
Шчасце!..
Гляджу я ўдалень,
рунь распасцерлася песняй
зялёнай—
Шчасце!..
...Вось і прыходзіць радок мне
на памяць,
можа і добры—
Шчасце.

Шчасце жыць і працаваць на нашай зямлі, шчасце быць песняром мужнага і добрага народа, шчасце, калі заўсёды не хапае часу.

Няхай жа яшчэ многа, многа сонечных вёсен сустракае наш слаўны і заўсёды малады юбіляр, няхай рунее яго песня добрым радком, усхваляваным, праўдзівым і важкім, няхай кожнае ранне прыносіць паэту шчасце, а яго шматмільённым чытачам радасць новых сустрэч з сапраўднай, шчырай і палымянай паэзіяй.

Дарогі, сустрэчы... Пятрусь Броўка са сваімі калегамі ў далёкім Дзіўнагорску, на будаўніцтве Краснаярскай ГЭС.

Пятрусь БРОЎКА

■ ■ ■

Вось узялі, падсумавалі
На сённяшні крытычны густ,
Партрэт у фас намалявалі
І з гліны вылепілі бюст.

Мой шлях жыцця як след
адбілі,
Пачаўшы ад дзядоў, здалёк,
А бібліёграфы злічылі
Амаль не кожны твой радок.

Адзначылі, ты майстар песні,
Крануў, як трэба і глыбей...
І, кажуць, ёсць ужо намеснік,
Што за цябе пайшоў далей.

Намеснік ёсць і адмысловы,
Яго я рады віншаваць...
Але, дазвольце мне хоць слова,
Мае таварышы, сказаць,

Сваё хай кожны адкрывае,
За гонар стрэць такіх лічу,
Ісці далей такім жадаю,
Я-ж сам-сабой ісці хачу.

Хачу шукаць. Хачу спрачацца,
Хачу яшчэ і шмат спазнаць,
Бывае, часам памыляцца,
Ды ад сяброў не адставаць.

Хоць часам я кажу такое:
— Зрабіў, што кольвек,
памаўчы!..
А верш, ён не дае спакою,
З грудзей ірвецца і крычаць.

Ну, што ж, ідзі, шукай
прыстання,
Шукай сваё ты берагі...
Але спакою ані звання,
Ірвецца ў свет і верш другі.

Няхай жа йдуць яны
ў бязмежжа,
Мяжы паэзіі няма...
А вось да кропкі,
што належыць,
Яна паставіцца сама.

Красавік, 1965 г.

Александр ПРОКОФЬЕВ

ПИСЬМО ДРУГУ

Дорогой Петр Устинович!

Сердечно поздравляю тебя с твоим торжественным днём! Ты видишь, что я не говорю в письме, с чем этот день связан, избегаю говорить, потому что думаю: все врут календари!

Дорогой друг, все же разреши мне сказать вот о чем. Когда я с тобой подружился? Давно. Несколько десятилетий тому назад. Но еще раньше, гораздо раньше я полюбил твою Беларусь, твою Отчизну, песни твоего народа. Я знаю твою Беларусь, не всю, конечно, и не так хорошо, как хотелось бы. Я ее знаю по стихам ее певцов Янки Купалы, Якуба Коласа, по твоим стихам и по стихам твоих песенных друзей и товарищей.

Твой народ (и не только он) читает и почитает тебя. Дорожить доверием народа, его любовью — незыблемый закон для всех нас, причастных к литературе и искусству. Ты знаешь и чтишь этот закон и твердо ему следуешь, ибо ты народен!

Народность в творчестве, как ты хорошо знаешь, дается не каждому. И ты и я считаем, что постичь, овладеть ею — это дар!

Ты прошел нелегкий, трудный путь: от пастушенка до Народного поэта Советской Белоруссии. Ты идешь по нему ныне в расцвете твоего таланта. За тобой большая жизнь. И я верю, что ты еще многими сторонами своей работы порадуешь своих друзей.

Книжку стихов, за которую тебе присуждена высшая награда Родины—Ленинская премия, — ты назвал «А дни идут». Они идут, дорогой друг, принося нам радости и печали. От души желаю тебе больше радостей и удач! Обнимаю тебя! Живи, твори и здравствуй!

г. Ленинград.

Микола БАЖАН

ХАЙ ЛИНЕ СЛАВА З УКРАІНИ!

Скільки разом пережито, побачено, відчуто, обговорено! Всього було на нашому шостидесятирічному шляху — і доброго, і гіркого, і світлого, і похмурого, і радісного, і сумного, але в усіх цих переживаннях, випробах і думах тільки кріплю в моєму серці відчуття дорогого сябра і друга—милого Петруся, як людини великої душі, чистого слова, живого и людяного таланту. Він так вміз кохатися в красі людей і природи, в чарах слова і пісні! Він так вміз ненавидіти потворне, гниле, злобне, нелюдське!

Я знову перечитую його білоруські томики, насолоджуюсь дзюркотливою, як ручай, мовою, ніжною, як берізка, піснею, широкою, як пуща, думою, величавою, як Німан, прозою.

Хай доля дає йому й надалі невичерних сил творити і співати на радість рідній Белорусі і всім нам, його братам, його сябрам, його читачам, його шанувальникам!

На любов українців до нього Петрусь Бровка відповідає щирою і вірною любов'ю, ще з дитячих років викоханою і прожитим півстоліттям зміцнілою, бо ж сам поет каже:

Між азераў Наддзвіння,
Між бароў і дубровaў
З песень маці пачуў я
Украінскае слова.

І на привіт славного білоруського поета, на

Прывітанне ад сына
Залатой Украіне,
Дарагой Украіне.—

хай лине в ці дні шестидесятирічча любого поета до нього на Батьківщину і наша щира українська слава!

Київ.

Эдуардас МЕЖАЛАЙЦІС

СТАРОНКІ ВЯСНОВАЙ КНІГІ

Вясна! Адзіная вечная кніга, якую чытаюць ад самага нараджэння да смерці...
П. Броўка, «Калі зліваюцца рэкі»

У 1924 годзе на дрымучай Ушаччыне землякі выбралі дзевятнаццацігадовага хлопца старшынёю сельсавета. Па тым часе гэта было ўжо не так незвычайна. Але іменна ў тыя гады камсамолец Пятрусь узяўся за жалейку паэзіі, раскрыў першыя старонкі «вясновай кнігі», якая потым стала здабыткам усёй савецкай літаратуры. І сёння, калі Народны паэт Беларусі і Ленінскі лаўрэат Пятрусь Броўка адзначае сваё шасцідзесяцігоддзе, гэта — свята і для нас, яго літоўскіх братоў, і яшчэ і для мяне асабіста — яго шчырага сябра, цаніцеля і таварыша па тэме.

У «Братэрскай паэме» я паспрабаваў аддаць належнае будаўнікам ГЭС, якая аб'яднала земляробаў трох рэспублік. І таму з хваляваннем чытаў «Калі злівaюцца рэкі» — задушэўную кнігу, прысвечаную электрастанцыі—сімвалу братэрства беларусаў з літоўцамі і латышамі, каханню Алеся да літоўкі Анежкі. Чытаў і раздумваў, як у светлым возеры новага жыцця назаўсёды раслі ільды кардонаў, якія падзялялі нашы народы, як шмат бачных і нябачных нітак звязваюць нас з Беларуссю: і Нямунас — Нёман, і родныя для нас Францыск Скарына і Кастусь Каліноўскі, і слаўная плеяда беларускіх паэтаў, якія тварылі і змагаліся ў цяжкія гады ў старажытным Вільнюсе... І невыпадкова сярод гасцей вызваленай Літвы ў першым савецкім годзе быў наш дарагі Пятрусь, які радаваўся разам з намі нашым першым поспехам!

А потым насталі грозныя, чорныя гады агульных выпрабаванняў, агульнага гора — гора, якое «клала на сэрцы след, як танк на зямлі». Крочачы па франтавых дарогах, паэт-воін Пятрусь Броўка, блізкі сябра пісьменнікаў Савецкай Літвы, якія знаходзіліся ў арміі і ў Маскве, чула сачыў таксама і за барацьбою літоўскага народа супраць агульнага ворага — гітлераўскіх захопнікаў. Нам зразумелыя і дарагія яго вершы ваенных гадоў, у якіх ужо развіваўся «горды сцяг перамогі», вершы пра вяртанне ў родны край і пра адраджэнне Беларусі з руін.

Патрыятычныя акорды заўсёды магутна гучалі ў творчасці народнага паэта-камуніста. І ярка паўстаюць у строфах Петруся Броўкі карціны беларускай прыроды, такой падобнай на нашу літоўскую. Мы нібы робім разам з ім няспыннае паломніцтва да «хаціны дзіцячых гадоў», да некалі дрымучага кутка, дзе курныя хаты бедна карміла крывуля-саха. І радуемся разам невыказнаму шчасцю новага жыцця, якое прыйшло ў Беларусь і Літву, на ўсе неабсяжныя прасторы савецкай зямлі.

Глыбокі водгук знаходзяць у нашых сэрцах яго гнеўныя радкі, звернутыя да катаў Асвенціма і тых, хто, прыкрываючыся «інакшым сцягам», хоча зноў абязводзіць чалавецтва. І паўтараем словы паэта-інтэрнацыяналіста:

Мір на ўсім свеце!

Быццам з нетраў роднай зямлі б'е светлая крыніца паэзіі Броўкі — б'е і не вычэрпваецца. Не злічыць перакладаў на братнія мовы, якія знаёмяць з Петрусём усю многанацыянальную савецкую сям'ю. З любоўю перакладаюць Броўку і літоўскія паэты.

З кожным годам множыцца незлічонае багацце многанацыянальнай савецкай паэзіі. І калі зноў вярнуцца да нашай агульнай электрычнай тэмы, дык можна сказаць: гэта гіганцкая электрацэнтраль жывой творчасці нязгасным зззянням асвятляе ўвесь зямны шар, саграючы мільёны, мільярдаў сэрцаў. І на гіганцкім аб'екце плённа працуе наш нястомны юбіляр.

Абавязкова хочацца, каб яму «жыць давялося год сотню, не меней». Не ад таго, што ім «зроблена мала», а іменна таму, што зробленае ім патрэбнае і каштоўнае для ўсіх нас, таму, што яшчэ чакаем мы новых і новых працягаў «вясновай кнігі», чытаць якую не стомімся!

г. Вільнюс.

Алесь ЗВОНАК

ШЧАСЦЕ

Петрусю БРОЎКУ

О, сіла часу! Хоць бы на хвіліну
Змог чалавек хаду тваю стрымаць,
І вечна-юнай далечы вяршыні
Адкрыла б ты яму тады сама...

Калі б... І ўсё ж скрозь тлум жыцця
зямнога
Ці раз праравуцца даўніх пор вятры
І хоць на міг саступіць час дарогу
Далёкай яве сонечнай пары.

Тады ўспамін бярэ кірунак просты
Ў свет, дзе уладарка — маладосць сама,
Дзе ёсць цяпло сапраўднага сяброўства,
Дзе месца чорнай зайздрасці няма;

Дзе памяць сэрца светлым адвячоркам
Заслону год пражытых расхіне —
І ты глядзіш з крутой Сафійскай горкі
На рух плытоў па ўзбуджанай Дзвіне...

Якія воку бачыліся далі,
Святло надзей праз амальгаму хмар,
Дзе ёсць усмешка светлая Купалы
І задуменны Коласаўскі твар!..

Дзе ёсць на грам удачы пуд няўдачы
І першы хлеб, зароблены радком,
Навекі сэрцу мілыя Ушачы,
І ласка маці, і бацькоўскі дом...

...Плыты сплылі. Абрыўкі ж летуценняў
Праз пылу залацістага налёт
Праступаць часам хараством нятленным,
Растопяць крохкі марнаслоўя лёд,

Каб зноў плыла паэзіі паводка,
Дзе бліскаўка сапраўднага радка
Была найдаражэйшаю знаходкай
У трапяткіх ад радасці руках...

О, часу ўлада! Усё ў цябе так проста,
А паспрабуй твой лад пераінач!..
Вось ты сыходзіш з Бруклінскага мосту
Былым хлапцом аднекуль з-пад Ушач.

Чужыя ветры кратаюць нясмела
Срабрысты пыл няшчаднай сівізны.
Ен мроіць: пахне вечар пахам спелым
Наддзвінскай той духмянай збажыны...

Ен мроіць: звоняць чыстыя крынічкі,
Гамоняць дзівы-дзіўныя бары,
І падаюць на дно азераў знічкі,
Як жніўеньскае поўначы дары...

Там родны дом, усё, што сэрцу міла,
Там цёплы подых росных берагоў...
І льецца ў песню голас мужнай сілы
Пад сінь нябёс айчыны дарагой...

О, песня сэрца! Усюды і заўсёды
Яна, як лёс, як неба ў светлы дзень,
Яна сяброўка ў горкі час нягоды,
У пору страт цяжкіх, у дні надзей...

Яна, як сонца першы бляск над светам,
Як першае любові пачуццё...
...Якое ўсё ж такі шчасце быць паэтам,
Навекі закаханым у жыццё!

Ян СУДРАБКАЛН

ВЫСОКАЕ СОНЦА ПАЭТА

Глыбока пранікае ў сэрца, заваладвае душою паэзія Петруся Броўкі. Уся яго творчасць, яго грамадская дзейнасць, усё жыццё народнага паэта і трыбуна, усе яго думкі і клопаты прысвечаны народу, прасякнуты любоўю да чалавека, да Беларусі.

Маскоўская «Юность» у майскай кніжцы надрукавала ў перакладзе на рускую мову яго «Кроплю крыві», і гэтая кропля яго паэзіі зноў заззяла ва ўсёй сваёй сіле і красе. «Жыві!»—уладарна загадвае яна чалавеку і прыродзе і заклікае абараняць наша цудоўнае жыццё, абараняць маці і дзяцей... На здымку ў часопісе Пятрусь Броўка малады, у вайсковай форме, але, дзіўна, мы такім успрымаем яго і цяпер, чуючы яго раскацісты голас. Мінула шмат гадоў, але сэрца народнага паэта юнае па-ранейшаму. Паэзія яго па-ранейшаму вабіць мяне з надзвычайнай сілай. Любі свой народ, гаворыць яна мне, сваю Радзіму больш за ўсё на свеце.

Інтымная лірыка Петруся Броўкі, яго глыбокі роздум, цудоўныя радкі, прысвечаныя прыродзе, палымяныя гімны жыццю і міру ва ўсім свеце, дружбе народаў, Беларусі, Камуністычнай партыі захапляюць сваёй праўдзівасцю, натуральнасцю, паэтычнасцю. Так льецца, зяе на сонцы, надае сілы людзям светлы струмень крыніцы.

Латышы добра, блізка ведаюць і моцна любяць Петруся Броўку. Гарачыя прывітанні нясуцца да яго з берагоў Даўгавы, Ліелупе, Венты і Гаўі, Янтарнага мора. Наша дружба з паэтам, з беларускім народам моцная і непахісная.

Шэсцьдзесят—гэта пара мудрай сталасці. І няхай доўга зяе над вяршынямі жыцця, над садамі і нівамі творчасці Петруся Броўкі сонца нябёсаў і сонца любві народнай.

г. Рыга.

ТАКІМ Я ЯГО ВЕДАЮ

Пятро ГЛЕБКА

Шмат на Беларусі прыгожых мясцін... Вы знойдзеце іх і на высокіх узгорках Міншчыны, і на роўных прасторах Случчыны, і сярод таямнічых і задуменных лясоў Палесся — над Бярозай і Прыпяццю, над Бугам і Нёманам, над Сожам і Дняпром. І ўсё ж, мне здаецца, няма больш прыгожых краявідаў, як у нашым азёрным краі. А сярод іх маё сэрца навек зачаравалі мясціны ў наваколлі Ушач. Цёмна-сіняя, зацененыя высокімі барамі азёры плешчуцца там у глыбокіх чашах, а светла-блакітныя, адкрытыя сонцу, пераліваюцца ў прамяністым бляску, нанізаныя на стужку Вушы, як пацеркі на нітку.

У гэтай непаўторнай краіне хараства нарадзілася і гадавалася песня Петруся Броўкі. Гадавалася ў беднасці, у галечы, у жабрацтве... Але яна ўвабрала ў сябе жыватворныя сокі той зямлі, пераняла яе красу і выйшла ў свет азораная мудрай праўдай жыцця.

Я некалі бываў у тых мясцінах, у піхай аблесненай вёсцы Пуцілкавічы. Відаць, гэта было вельмі даўно, таму што майму нязменнаму і добраму другу сягоння ўжо шэсцьдзесят, а тады ж мы былі яшчэ маладыя, бадай, толькі пачыналі свой літаратурны шлях.

Дагэтуль, як жывая, перада мной стаіць маці паэта — чулая і добрая, строгая і справядлівая. З якой чыстай радасцю сустракала яна заўсёды нас — свайго сына і ягоных гасцей! Нарэжа скрылікамі духмянай сялянскай каўбасы, паставіць пляшку настоенай на розных травах гарэлкі, абапрэцца на стол спрацаванымі рукамі і глядзіць на нас моўчкі і замілавана. А пачнём мы з нашым маладым размахам разносіць таго ці іншага са сваіх літаратурных «працінікаў», прыпыніць ціха і скажа:

— Няможна так, хлопцы! Праўда, вы маладыя, няўрымслівыя... Але ж на вас глядзяць ужо, як на сталых. Шануйцеся ж і людзей шануйце!

У часы гітлераўскай навалы маці паэта загінула ў Асвенціме, неадступна верачы ў сынаву праўду, у тое неўміручае слова, якое перадала яна з уласнага сэрца сэрцу сына.

Многа напісана добрых артыкулаў і нават цэлых даследаванняў аб творчасці Петруся Броўкі. Не раз пісаў аб ім і я. Але і дагэтуль нізае не прачытаў і сам не здолеў вызначыць для сябе ды назваць людзям тую сілу, якая закладзена ў яго паэзіі. Ведаю толькі, што сіла гэта сапраўды значная і глыбока чалавечная.

Не адразу на поўны голас загучала гэта сіла ў творчасці П. Броўкі. Яе пошукам, пошукам глыбокай людской праўды і таго адзінага жывога слова, якое магло б данесці гэту праўду да чалавечага розуму і сэрца, паэт прысвяціў усё сваё жыццё. І пошукі гэтыя вяліся не на вузкіх крывых сцежках, не ў цёмных закутках, а на галоўных магістралях жыцця і барацьбы народа за свой сучасны і будучы лёс.

Не ўсё, што робіцца на свеце і адыходзіць у мінулае, становіцца гісторыяй. Паэзія П. Броўкі ўвайшла ў гісторыю — не таму, што яна мае сваю даўнасць, што ёй неўзабаве будзе сорак гадоў, а таму, што яна з кожным годам узнімалася з прыступкі на прыступку ўсё вышэй і вышэй, таму што яна забірала ў свой абсяг усё шырэйшыя і шырэйшыя кругагляды, таму што яна цякла ў асноўнай плыні нашага нястомнага руху наперад і наперад.

Я перагортваю пажоўклыя старонкі зборнікаў паэта, адбітых на грубай шэрай паперы ў 20-я — 30-я гады, і кніг, надрукаваных на бялюткіх аркушах, выдадзеных у раскошнай аправе ў наш час...

Вось самыя першыя крокі маладога вясковага хлопца ў літаратуру — зварот да роднай, пакінутай у вёсцы бярозкі... А вось паэма «Прамова фактамі», сама назва якой нібы падкрэслівае не столькі паэтычны, колькі жыццёвы яе змест. А вось ужо больш смелая заяўка — зборнік «Паэзія». Але і да яго паэт ставіцца самакрытычна. У надпісе на экземпляры гэтай кніжкі, падараваным мне, ён адзначае: «Гэта толькі ўступ да паэзіі. Будзем чакаць новага». Нават яшчэ праз тры гады, на кнізе, шматзначна і правільна названай «Прыход героя», дзе ўжо былі змешчаны такія паэтычныя рэчы, як «Зямля», «Праз горы і стэп», «1914», Пятрусь Броўка з жартаўлівай усмешкай піша: «Пакуль што крыху крануў, трэба глыбей...»

Безумоўна, за гэтай сціпласцю і жартаўлівасцю адчуваецца і радасць паэта за свае першыя значныя поспехі. Яны былі радасцю і для ўсёй нашай літаратуры, таму што ў кнізе «Прыход героя» быў прыход сапраўднай паэзіі. Я памятаю, як абрадавала нас паэма П. Броўкі «1914». Ен чытаў яе ўпершыню на кватэры ў Кузьмы Чорнага. Мякка ступаючы, усхвалёвана хадзіў па пакоі гаспадар кватэры. Маўкліва і засяроджана слухаў Кандрат Крапіва...

Шмат гадоў мінула з тых дат. П. Броўка напісаў многа добрых і выдатных твораў. Гаварыць пра іх ці нават называць — няма патрэбы: іх добра ведаюць не толькі ў нашай рэспубліцы, але і далёка за яе межамі. З даўніх часоў сяброўчы з паэтам, я меў шчасце часта заглядваць у яго творную «лабараторыю». І мне б хацелася яшчэ раз падкрэсліць толькі, што «лабараторыя» гэта не ў кабінеце, не за сталом пісьменніка, а на шырокіх прасторах жыцця, на ніве жывой грамадскай дзейнасці П. Броўкі, у яго шчырым таварышаванні з людзьмі, з шматлікімі сябрамі з самых разнастайных колаў нашага грамадства.

У гэтым, відаць, сакрэт і яго заўсёды маладога таленту, і творчага натхнення, і выдатных поспехаў.

ГАНАРЫМСЯ ЗЕМЛЯКОМ

— Лепельшчына радзіма Пятра Усцінавіча Броўкі. Тут ён рос, вучыўся. Нашы краявіды натхнялі яго на вершы. Многія нашы людзі — не толькі прыхільнікі яго паэзіі, а і сябры яго юнацтва.

Лепяльчане любяць творчасць Броўкі, уважліва сочаць за ёю. Многія напамяць ведаюць і «Надзю-Надзейку», і кавалкі з «Кацярыны», «Беларусі». Вялікім попытам у чытачоў карыстаецца раман «Калі злівaюцца рэкі». Зборнік жа «А дні ідуць», за які Пятру Усцінавічу прысуджана Ленінская прэмія, — адна з самых любімых кніг і старэйшых і моладзі. Да глыбіні душы кранае яго паэма «Голас сэрца», прасякнутая смуткам па загубленай у Асвенціме маці, паэма-заклік да абароны міру на зямлі.

Зараз на Лепельшчыне праходзяць вечары, прысвечаныя творчасці народнага паэта. Землякі жадаюць Петрусю Усцінавічу здароўя і многіх гадоў жыцця, чакаюць яго новых выдатных твораў.

К. САЛОДКІНА, настаўніца.

г. Лепель.

З ЧЫСТЫХ КРЫНІЦ

«Не буду я стаяць на раздарожжы, вачыма сумнымі глядзець у далячынь...» Кожны раз, калі раблю для старшакласнікаў агляд творчасці Петруся Броўкі, я пачынаю з гэтых радкоў, напісаных амаль сорак год назад. Ужо тады паэт вызначыў сваё нрада і ніколі не адступаў ад яго, заўсёды быў на пяразнім краі жыцця.

І сёння, перагортваючы зборнікі паэта — пажоўклыя ад часу і тыя, што яшчэ пахнуць друкарскай фарбай, — бачыш, як з гэтага першага верша, з гэтага ручайка пачыналася рака паэзіі. Тая самая, у якой адлюстроўваліся надзеі і гнеў, боль і радасць людзей, іх думкі і імкненні, якая заўсёды жывілася з чыстых крыніц народнага жыцця народнай мовы.

Прыгадваецца такі выпадак. Вярнуўшыся з Амерыкі (гэта было ў 1959 годзе), П. Броўка надручаваў у «Полымі» нізку новых вершаў «З-за аніяна», якія потым увайшлі ў кнігу «А дні ідуць». Я пазнаёміў з гэтымі вершамі сваіх дзесяцікласнікаў. Пачалася размова. І вось адзін з вучняў зазначыў: «Як гэта добра, калі вершы напісаны так шчыра, так проста і ў той жа час кранаюць да глыбіні душы. Прачытайце, калі ласка, яшчэ раз вершы «Хлеб» і «Калі на ўсход я раннам глянў...» Я зноў чытаў вершы, у яніх паэт выказваў сум па Радзіме, і бачыў, як твары юных чытачоў робяцца то засяроджанымі, то прасветленымі. «Вось яно,— думаў я, — сапраўднае прызначэнне паэзіі — уваходзіць у чалавечае сэрца і хваляваць яго».

У дзень шасцідзесяцігоддзя паэта мне ён чытаў і яго выкладчыку нашай роднай літаратуры хочацца падзякаваць яму за шчырыя хвалюючыя творы і пажадаць добрага здароўя і маладога творчага запалу на доўгія-доўгія гады.

С. ПАСЬ,
выкладчык беларускай мовы і літаратуры Шчадрынскай сярэдняй школы Жлобінскага раёна.

ПРЫГОЖАЕ — У БЫТ

КАЛІ ЗАГЛЯНУЦЬ НЕ З ГЛЯНЦАВАГА БОКУ...

ШТО ТУРБУЕ ІВЯНЕЦКІХ КЕРАМІКАЎ

У кабінеце дырэктара Івянецкай фабрыкі мастацкай керамікі і вышыўкі Марыі Ільінічны Зальцман прыцягвае ўвагу шафа. За шклом яе, на палічках акуратна расстаўлены шматлікія, непадобныя адна на адну, вазы і вазачкі, сподачкі і салатніцы, абанкі, прыборы для віна, сувеніры... Яны зіхацяць палівай, радуюць вока маляўнічымі ўзорамі. Выкананы проста, самабытна, прыгожа.

Бачачы, што я з захапленнем разглядаю іх, Марыя Ільінічна гаворыць з нейкім дакорам у голасе:

— Вось так і ўсе, хто прыязджае да нас, захапляюцца вырабамі, хваляць іх, пішуць у газеты, а ніхто не спытае, якія ж у нас цяжкасці ёсць, недахопы...

Сапраўды, я таксама шмат чытаў пра славутых івянецкіх керамікаў. Іх называлі і народнымі ўмельцамі, і самабытнымі мастакамі. Адным словам, допісы былі поўныя замілавання, і ніхто не зважаў на іншы, больш празаічны бок...

Няхай не падумае чытач, што я супраць пахвалы івянецкім керамікам. Не, сам я доўга стаяў і любаваўся работай старэйшага ганчара Віктара Феліцыянавіча Кулікоўскага. Колькі майстэрства, спрыту ў яго разумных руках! І не дзіва, за ганчарным жа колам ён працуе амаль сорак гадоў. Ад бацькі, ад дзядзькі пераняў Віктар Феліцыянавіч уменне ляпіць посуд з гліны. І цяпер сам перадае свой вопыт моладзі. Поруч са старэйшым майстрам працуюць кемлівыя хлопцы Віктар Кулікоўскі, Антон Пратаповіч, Міхаіл Звярко.

Захапляўся я і працай расвальшчыка Баніфацыя Сасноўскага. Нават не тое слова сказаў я—«праца». Гэта ж сапраўдная творчасць! З-пад рук Баніфацыя бягуць па вазах раўнюткія рознакаляровыя паяскі, расцвітаюць фарбамі дзівосныя ўзоры. І Антон Мікіцкі, і Міхаіл Чупрыс, і Яўгенія Маўчановіч зайздросцяць свайму таварышу, вучацца ў яго тонкаму майстэрству расвальшчыка...

Але ў гэтым артыкуле я ўсё ж збочу з традыцыйнага шляху замілавання працай народных умельцаў, пра якое ўжо казаў, і пагляджу на некаторыя рэчы не з глянцавага боку.

Перш-наперш — пра керамічны цэх. Пабудаваны ён два гады назад. Тады ж на базе былой арцелі ганчароў у Івянцы і была створана фабрыка. Узрадаваліся керамікі, перасяляюцца з паўсаматужных майстэрняў у новы цэх. Але сустрэў ён сваіх гаспадароў непрыветна. Гаварылі, што тут будзе амаль поўная механізацыя асноўных працэсаў, а яе не было.

Пачалі самі збіраць яго, як кажуць, па гайцы і па вінціку.

Прачулі, што ў Століне на прамкамбінаце ёсць непатрэбны транспарцёр — паслалі за ім машыну, прывезлі. Хоць і малаваты ў яго канвеер, але сяк-так падае гліну, усё ж лепш чым уручную.

У Дзяржынску ў прамкамбінаце глінамяшалку выкінулі былі ўжо на звалку. Паехалі туды, папрасілі прадаць яе...

Калі б узяць карту і накрэсліць маршруты, па якіх адпраўляліся танцы з фабрыкі ў пошуках таго ці іншага абсталявання, то лініі разбеглісь б ў многія бакі. Адна з іх прывяла б у Мінск, адкуль прывезлі ў Івянец такарны станок, таксама ўжо не новы, другая б паказвала на Пінск, куды керамікі ездзілі за шчокавай драбілкай — машынай для размолу пігматыту. (Дарэчы, вярнуліся назад з парожнім, бо мясцовы камбінат будаўнічых матэрыялаў раптам раздумаў яе прадаваць).

З Радашковіч прывезлі бегуны для размолу пігматыту ў парашок. Жорны купілі ў прыватніка...

— Што зробіш,—адказала.— Фінансавы план выконваць жа трэба. З нас патрабуюць вал.

На самай справе, з фабрыкі **мастацкай** керамікі і вышыўкі, як і з іншых прадпрыемстваў мясцовай прамысловасці, у першую чаргу патрабуюць гэты самы «вал». На яе глядзяць, як на промысел, які павінны прыносіць даход. А выконваць план лягчэй за ўсё за кошт гых жа самых гаршчочкаў ды іншых не асабліва працаёмкіх вырабаў, вытворчасць якіх, як кажуць, можна паставіць на канвеер. Дык чым жа ў такім разе мастацкая фабрыка адрозніваецца ад ганчарнага цэха любога прамкамбіната?

Я разумею, што фінансавы план выконваць трэба таксама. Але ж іншыя мажлівасці ёсць для гэтага — рэканструкцыя цэха, распрацоўка новых цікавых узораў вырабаў і г. д.

Як паведаміў Карупаў, фабрыка асвоіла ўжо выпуск звыш 80 узораў керамічных вырабаў. Лепшыя з іх якраз і бачыў я ў шафе ў кабінеце Марыі Ільінічны. Але не дарэмна яна перасцерагала мяне, каб асабліва не захапляўся імі. Шмат якія з гэтых вырабаў засталіся ўзорамі, не ўбачылі паліц магазінаў, не ўпрыгожылі кватэры людзей. У гэтым у значнай ступені вінаваты зноў той самы «вал».

Зразумела цяпер, чаму ў вытворчасці керамічнага цэха фабрыкі пераважаюць бытавыя вырабы і мала сувенірных, падарункавых. А прыгожыя сувеніры, падарункі вунь як патрэбны!

Я не кажу, што зусім на фабрыцы забыліся пра сувеніры. Сёе-тое выпускаецца, скажам, традыцыйныя пеўнікі-свісцёлачкі, рыбкі, жырафы... Але ўсё гэта разлічана на дзіцячы густ (хоць я і не супраць таго, каб забаўляліся дзеці). Таму на фоне ўсяго гэтага арыгінальным паказаўся мне зубронак, выкананы Карупавым. Аказваецца, ён знаходзіцца ў павільёне лепшых узораў керамікі ў Мінску. А вось масавы выбар яго пакуль што і не наладжан.

Народная кераміка... З далёкіх стагоддзяў бярэ яна карэнні на беларускай зямлі. Умелі нашы продкі рабіць дзівосны посуд з гліны, уласціва было ім пачуццё прыгожага. Аб гэтым сведчаць знаходкі археолагаў пад Мінскам, Полацкам, Навагрудкам... Аднак мала ў музеях яшчэ гэтых знаходак, калекцый. У многім вінавата і вайна. Так, у час блакады Ленінграда ў будынак этнаграфічнага музея трапіла бомба і тут загінула багатая калекцыя беларускай народнай керамікі. Загінула шмат керамічных вырабаў і ў Мінскім музеі.

Цяпер жа зборам керамічных вырабаў народных умельцаў амаль ніхто не займаецца. Нават у рэспубліканскім Доме народнай творчасці няма такой калекцыі.

Гэта не адхіленне ад тэмы. Я хачу сказаць, што менавіта івянецкія майстры і павінны ў поўнай меры адрадзіць славу беларускай народнай керамікі. Тут, як нідзе, захаваліся традыцыі ганчарнага рамяства, жыве шмат умельцаў. Яны аб'ядналіся ў калектыў, што яшчэ больш спрыяе творчасці. На дапамогу ганчарам прыйшлі два мастакі. Хоць і дрэнна пакуль што абсталяван цэх, але ж гэта ўжо не паўсаматужныя майстэрні. І калі ў Галоўным упраўленні бытавога абслугоўвання і мясцовай прамысловасці паклапоцяцца, каб яго хутчэй рэканструявалі, не будуць глядзець на фабрыку, як на звычайны промысел, а памятаць, што яна **мастацкая**, то слава пра івянецкіх (а гэта значыць беларускіх) керамікаў пойдзе яшчэ далей.

Сямён БЛАТУН,
спец. кар. «Літаратуры і мастацтва».

Лясная сажалка.

Фотаэцюд нашага чытача **А. ГЛІНСКАГА** (Мінск).

СЛОВА ДА МАЛАДЫХ

Мастака Марціроса Сар'яна не трэба прадстаўляць. Яму належыць асаблівае слова ў мастацтве — новае, свежае, якое вылучна за рамкі звычайнага.

Сар'ян зараз у Маскве: у Доме мастака адкрыта яго персанальная выстава. Жывапісец сустракаецца з гледачамі, з дзеячамі савецкай культуры і мастацтва. Марціроса Сар'яна, выдатнага майстра, не можа не хваляваць далейшы лёс савецкага выяўленчага мастацтва. А ён у руках моладзі. Да іх, маладых мастакоў, і звяртаецца сёння Марцірос Сар'ян, славуты савецкі жывапісец.

У работах маладых мастакоў я больш за ўсё цаню натхняючае пачуццё адкрыццё, уменне здзіўляцца прыгажосці свету і чалавека, бачыць новае і па-новаму яго паказваць. Я не памятаю тых мастакоў, старэйшага пакалення, якія злуюць, калі бачаць, што моладзь працуе інакш, чым яны. Вядома, гэта смешная лёгкадумнасць — адкідаць вялікі вопыт старэйшых пакаленняў. Але я вітаю тых жывапісцаў і скульптараў, якія, вучачыся ў старых, шукаюць нязведаныя, непратаптаныя дарогі, рвуцца ў невядомае, непазнанае.

Я вітаю смелых і непадобных!

Мы жывём у свеце, які мяняецца літаральна на вачах.

Заваёвы тэхнічнага прагрэсу настолькі аглушылі некаторых людзей, што яны загаварылі нават пра адміранне мастацтва, якое быццам стала архаічным, як дыліжанс ці конка ў эпоху касмічных ракет.

А, па-мойму, мастацтва цяпер патрэбна як ніколі. Што ж, апроч мастацтва, зможа ачалавечыць, наблізіць да людзей здзіўляючыя адкрыцці навукі і тэхнікі? Без дотыку творчай думкі мастака яны застануцца халоднымі абстракцыямі, бяздушнымі робатамі, варожымі чалавеку, далёкімі ад яго.

Для таго, каб сучаснае мастацтва магло выканаць сваё вялікае прызначэнне, яму патрэбны маладыя мастакі. Або, больш дакладна сказаць, мастакі з маладой душой, насцеж адкрытай усім уражанням быцця, высокім ідэалам дабра і справядлівасці, сапраўдным законам прыгажосці.

Такія мастакі здолеюць перамагчы ілжывую мудрасць, пад якой бы маскай яна ні хавалася, і запаліць у сваіх творах сонца прыгожага, якое будзе асвятляць радасным святлом дарогі сучаснікаў, сагрэваць іх сэрцы, прасвятляць душы.

Няхай жа жыве бясконцая маладосць творчасці, перамога чалавечай свабоды, вечнае юнацтва сапраўднага мастацтва!

Марцірос САР'ЯН,
лаўрэат Ленінскай прэміі,
Герой Сацыялістычнай Працы
(АДН).

ПРЫХІЛЬНІКІ ЧЭХАВА Ў СКАНДЫНАВІІ

Год выдання гэтай кнігі — 1894. Мова — нарвежская. Назва — «Палата № 6». Гэта адзін з першых чэхаўскіх твораў, перакладзеных на нарвежскую мову.

У Скандынавіі даўно ведаюць выдатнага майстра рускай прозы А. П. Чэхава. У асабістай бібліятэцы пісьменніка, якая захоўваецца цяпер у ялцінскім Доме-музеі, ёсць зборнікі чэхаўскіх твораў на дацкай, шведскай, нарвежскай мовах, якія выйшлі ў 1892—1898 гг.

— У нашы дні,—паведаміў карэспандэнту АДН навуковы супрацоўнік Дома-музея Сяргей Брагін, — колькасць прыхільнікаў вялікага рускага пісьменніка ў Скандынавіі намнога ўзрасла. Калі чэхаўскі музей наведала нарвежская каператыўная дэлегацыя, яна пакінула ў кнізе водгукаў такі запіс:

«Азнаямленне з домам, у якім вялікі рускі пісьменнік жыў і тварыў, пакідае незабыўнае ўражанне. Памяць аб знаходжанні ў ім будзе садзейнічаць глыбокаму вывучэнню творчасці пісьменніка. Усё гэта важна пры ўзаемным абмене культурнымі каштоўнасцямі».

А праз некаторы час член дэлегацыі, кіраўнік аддзела каператыўнага саюза Нарвегіі Свейн Дален паведаміў:

«Мы абяцалі знайсці навейшыя выданні Чэхава на нарвежскай мове і прысласць вам. Пасля прыезду дадому набылі для музея дзве кнігі Чэхава, якія выйшлі ў апошнія гады: «Чайка» і «Апавяданні».

На шведскую, нарвежскую і дацкую мовы перакладзены ўсе п'есы Чэхава. Яны пастаянна ідуць у буйнейшых тэатрах паўночных краін. «Публіка прымала спектакль з рэдкай цеплынёй і натхненнем»,— пісаў пра пастаноўку «Чайкі» ў Осла ў 1963 годзе крытык Марцін Нас. Ён тлумачыў гэта тым, што «тэатр зразумеў і перадаў тую сілу, якую выпраменьвае талент Чэхава». Наведаўшы музей, міністр культуры Даніі Ю. Бамхольт расказаў, з якім поспехам у каралеўскім тэатры ў Капенгагене і ў муніцыпальным тэатры ў Одэнсе—радзіме вялікага дацкага пісьменніка Ханса Андэрсена — ідзе «Чайка», «Дзядзя Ваня», «Вішнёвы сад», «Апладысменты — не проста абавязак ветлівасці, як гэта нярэдка здараецца,— гаварыў Ю. Бамхольт. — Гледачы бываюць горача ўсхваляваныя надзвычай пранікнёным разуменнем Чэхава».

Гарачы прыхільнік пісьменніка і рускага тэатра дацкі выдавец і журналіст Эліп Хансен падарыў музею фотаздымкі муніцыпальнага тэатра г. Одэнсе, а вялікая група актыўстаў — членаў таварыства «Швецыя—СССР» прыслала са Стакгольма цэлы пакет з фотаздымкамі і тэатральнымі праграмамі чэхаўскіх спектакляў, якія ішлі за апошнае дзесяцігоддзе на шведскай сцэне.

Тольні за апошні час выстаўка зарубежных выданняў А. П. Чэхава ў музеі папоўнілася зборнікамі яго п'ес на дацкай і шведскай мовах, аднатомнікам апавяданняў на нарвежскай мове і вялікай кнігай на шведскай, прысвечанай жыццю і творчасці пісьменніка.

Сяргей ШАНТЫР,
карэспандэнт АДН.

З РОЗНЫХ ШЫРОТ

ІРАНСКАЕ КІНО

Іранскі кінематограф у адрозненне ад свайго сабрата па мастацтву — народнага лялечнага тэатра «Пахлеван качал» з яго багатай гісторыяй не можа пахваліцца сваім узростам: ён зарадзіўся толькі ў пасляваенны перыяд.

Першая іранская кінастудыя «Мітра-фільм» была створана ў 1947 годзе д-рам Кушанам. Выпушчаны ёю фільм «Бура жыцця» быў, як адзначалі газеты, такі дрэнны «з усіх пунктаў гледжання», што назат нарадзіў у гледачоў нявер'е ў будучыню іранскага кіно. Студыя «Мітра-фільм» спыніла існаванне.

Аднак д-р Кушан не быў збянтэжаны і хутка стварыў новую студыю — «Парс-фільм», дзейнасць якой аказалася такой удалай, што цяпер яна лічыцца адной з самых буйных кінастудый у Іране.

Папулярнасць кінафільмаў сярод іранцаў прымусіла ўласнікаў капіталаў павярнуць свае сродкі на будаўніцтва кінатэатраў. Ва ўгоду прадпрыймальнікам быў нават прыняты закон, які вызваляе ўласнікаў кінатэатраў ад платы падаткаў на шэсць месяцаў у Тэгеране і на адзін год у правінцыі. Банк развіцця пачаў прадастаўляць для будаўніцтва кінатэатраў пазыкі пад нізкі працэнт.

Цяпер ў Тэгеране 75 кінатэатраў, у Абадане — восем, у Мешхедзе — сем, Таўрызе — шэсць, Керманшаху — пяць. Праўда, такія гарады, як Кум, Кашан, Кердж пакуль не маюць кінатэатраў.

Вялікая перашкода ў развіцці айчыннага кінамастацтва — перапаўненне Ірана замежнымі фільмамі, сярод якіх пераважаюць амерыканскія баевікі. Іран штогод імпартуе замежных фільмаў амаль на тры мільёны долараў. Некаторыя замежныя кінакампаніі ўстанавілі ў Іране свае філіялы, якія займаюцца дубліравачнем фільмаў і іх распаўсюджваннем у краіне.

Аднак, нягледзячы на гэта, іранскі кінематограф дамагаецца пэўных поспехаў. Апроч «Парс-фільм», у краіне паспяхова працуюць студыі «Місаніе», «Іран-фільм», «Асрэ талаі», «Мехрэгэн-фільм», «Атлас-фільм», «Караван-фільм». Артысты — Джафары, Мохсені, Вахдат, актрысы Тэхмін, Джэйл, Апік, Шахла, якія здымаюцца ў іранскім кіно, вядомыя і за межамі Ірана.

У іранскага кіно слабая яшчэ матэрыяльна-тэхнічная база, невялікі вопыт рэжысёраў і сцэнарыстаў. Аднак некаторыя іранскія фільмы атрымалі міжнароднае прызнанне. Так, фільм «Агонь» на адным з апошніх кінафестываляў у Венецыі быў адзначан прэміяй.

Д. КАСАТКІН.
(ТАСС).

ЗАБАРАНЯЮЦЦА АНТЫВАЕННЫЯ ФІЛЬМЫ

Заходнеберлінская газета «Шпандауэр фольксблат» апублікавала спіс забароненых у ФРГ фільмаў з сацыялістычных краін. У гэтым спісе называюцца савецкія фільмы «Новы Гулівер», «Непаўналетнія» і кароткаметражны фільм «У Сенегале», а таксама рад патрыятычных і антываенных фільмаў ДРВ і некалькі польскіх, чэхаславацкіх і венгерскіх фільмаў.

Пералічыўшы назвы і кароткі змест усіх гэтых фільмаў, «Шпандауэр фольксблат» адзначае, што ў большасці выпадкаў забароненыя фільмы маюць бясспрэчны сюжэт або з'яўляюцца падкрэслена антываеннымі фільмамі. Аднак з салідарнасці з амерыканскай палітыкай у Паўднёвым В'етнаме і з іншых палітычных меркаванняў у Боне вырашылі забараніць гэтыя фільмы.

М. ПАНЬШЫН,
кар. ТАСС.

ПРАЕКТ НОВАГА РАЯЛЯ

Адна з лепшых французскіх піяністак Моніка дэ ла Брушольры прапанавала праект зусім новага раяля, у якім клавіятура размешчана паўкругам. Яна тлумачыць гэта тым, што класічны раяль, які не мяняў сваю форму з XVIII стагоддзя, не адпавядае больш тым патрабаванням віртуознасці, якія прад'яўляюцца цяпер да выканаўцаў твораў сучасных кампазітараў. Апроч таго, раяль Моніці дэ ла Брушольры будзе забяспечаны электроннай кнопкай, якая дазваляе браць акорды ад дзвюх да дванаццаці нот адначасова, у выніку чаго ў піяністаў будзе быццам трыццаць пальцаў. Першы прататып будзе гатовы пад канец года.

Газета «Пары Прэс-Энтрансіжан» спытала ў выдатных кампазітараў і выканаўцаў, што яны думаюць пра такі раяль.

Маргарыта Лонг на сто працантаў за гэты праект. Мішэль Бёгнер прызнае, што сучасная музыка мае патрэбу ў новым фартэпіяна. Артур Рубінштэйн прытрымліваецца такой жа думкі, але апасаецца, як бы гэтая навіна не выбіла з калёіны многіх выканаўцаў. Пярэчыць, у прыватнасці, Філіп Антрэмон, які, як ён сам заўважае, «не хоча зноў вяртацца ў школу».

А. МАНЬЕНАН,
кар. ТАСС.

Куток калекцыянера

СЕРЫЯ «МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА»

Барацьбе за мір, дружбу, міжнароднае супрацоўніцтва прысвечана новая серыя з трох марак. На адной з іх, коштам у тры капейкі, адлюстравана планета Зямля з яркі акрэсленымі мацерыкамі абодвух паўшар яе. На цёмным небе, усеяным зоркамі, — касмічныя спадарожнікі сувязі. Малюнак акаймоўвае з двух бакоў надпіс **«Міжнароднае супрацоўніцтва»**. Другая марка гэтай серыі наміналам у шэсць капеек адлюстроўвае супрацоўніцтва вучоных Савецкага Саюза ў міжнародных арганізацыях з вучонымі многіх краін. На цёмна-сінім фоне выразна відаць зоркі і планеты. На пярэднім плане — вялікая дынамічная залацістая зорка, апераезаная арбітамі касмічных рэйсаў. На марцы надпіс: **Каспар. Маф. Камітэт ААН** па мірным выкарыстанні космасу. Другі надпіс на палях з двух бакоў малюнка гаворыць «СССР супрацоўнічае ў міжнародных арганізацыях».

Дзесяць гадоў эканамічнага супрацоўніцтва СССР і Індыі — такая тэма апошняй маркі гэтай серыі. Зялёнага адцення паўвостраў Індастан амываецца акіянам. На гэтым фоне пададзена абрысавае адлюстраванне Бхілайскага металургічнага завода, пабудаванага пры ўдзеле Савецкага Саюза, і малюнак каўша, з якога льецца расплаўлены метал. Наміналы марні — шэсць капеек.

Усе тры маркі серыі «Міжнароднае супрацоўніцтва» выкананы па малюнках мастака Яўгенія Аніскіна. Іх памеры — 21,5 на 32,5 міліметра. Друк плоскі. Зубцоўка — грабенчатая.

Марыя КАВАЛЕВА.
(АДН).

ДА ЗАКЛЮЧНАГА КАНЦЭРТА

Народны ансамбль песні і танца Мінскага Дома культуры працоўных разерваў у складзе 120 чалавек днямі вярнуўся з гастрольнай паездкі ў Маскву. Калектыў выступіў на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі, у Цэнтральным парку культуры і адпачынку імя М. Горкага, на заводзе «Калібр», у піянерскім лагеры «Арлёнак», Маскоўскім Доме культуры працоўных разерваў. Самадзейныя артысты паказалі «Лявоніху», танец баскаў з балета «Полымя Парыжа», танец «Працоўныя разервы», а таксама рускія і польскія танцы, выканалі беларускія і рускія песні. Цяпер калектыў рыхтуецца да заключнага канцэрта ў Маскве, які адбудзецца ў кастрычніку гэтага года ў гонар 25-годдзя працоўных разерваў.

На здымку — народны ансамбль танца рэпетыруе «Лявоніху».

ВІРТУОЗЫ ЧОРНА-БЕЛЫХ КЛАВІШАЎ

Пануючае становішча фартэпіяна сярод канцэртных інструментаў ужо налічвае паўтара стагоддзя. А царству яго не відаць канца. І хаця ўжо зусім вызначыўся тып будучага канцэртнага фартэпіяна (у абліччы клавішна-электронных механізмаў), мы сёння слухаем з няменшым задавальненнем гэты цудоўны клавішны «арнестр», заплочаны ў чорную каробку.

З уходам выдатных музыкантаў-выканаўцаў сучаснасці Уладзіміра Сафраніцкага і Генрыха Нейгауза не скончылася крыніца фартэпіённай паэзіі. І сярод захліставючага сусветным канцэртным падмосткі «ўдарнага», маторна-рытмічнага піянізму квітнее ў савецкай школе выканання вялікая рамантычная традыцыя. «Староўе» рамантычнае фартэпіяна яшчэ надзейна супрацьстаіць наспонам заўзятых мадэрнізатараў. І не выпадкова Скрабін — гэты апошні з «паэтаў фартэпіяна» — стаў прадметам увагі многіх савецкіх піяністаў.

Цыкл канцэртаў з твораў Скрабіна правяла ў гэтым сезоне лаўрэат Міжнародных конкурсаў Маргарыта Фёдарава. З насычанай скрабінскай праграмай выступіў у Вялікай зале прафесар Масноўскай кансерваторыі Віктар Мяржанаў. У сярэдзіне мая манаграфічны канцэрт з твораў Скрабіна ў Малой зале адкрыў масвячам новага таленавітага «скрабініста» — Ігара Жукава — ужо вядомага ў радзе замежных краін і гарадоў СССР.

Ігар Жукаў выступае як прадаўжальнік традыцый Сафраніцкага — непераўзыйдзенага выканаўцы Скрабіна. Яму ўдаецца галоўнае: стварыць магутны эмацыянальна-псіхалагічны падтэкст выканання, раствораць элементы знешняй віртуознай «канцэртнасці» ў глыбінях драматургіі Скрабіна. Сваім палаючым (але стрыманым знешне) пачуццём піяніста-рамантыка ён пранікае ў запаветны свет скрабінскай палітрацы і тамлення, свет трапятной «тэхніні нерваў», якая стала неад'емным атрыбутам скрабінскага стылю. Раяль пад яго пальцамі зазе сотнямі розных тонаў і, узрываючыся, радасна б'ецца ў экстатычных гімнах святлу. І толькі дзе-нідзе піяністу не хапае нервовай энергіі.

А праз некалькі дзён, ва ўтульнай зале Дома вучоных, выступаў другі прыхільнік паэтычнага фартэпіяна. Музыка Шапена і Скрабіна распрывалася ў даўным узвышаным ладзе, у бясконца распетых гунавых далях. Са сцэны ў глядзельную залу лілася рэчка па прыгажосці гармоніі гунаў і фарбаў. Паднесены слухачамі ахапак палаюча-чырвоных кветак, нінуты пад чорнае крыло раяля, адцяняў і светлы фон драпіроўкі сцэны, і строгі сілуэт піяніста з капою непаслухмяных, рана пасівелых валасоў. Іграючы, ён папраўляў іх знаёмым «нейгаўзаўскім» жэстам... і таксама, як у Нейгауза-бацькі, у Нейгауза-сына ў трактоўцы Скрабіна не было ні лішняга нервовага надлому, ні жмрочных «урубеўскіх» фарбаў. Выразныя пальцы малявалі вобразы сузіральна-жывапісныя, прасветленыя, якія жывуць адкрытай страсцю да жыццесцвярджэння.

Зусім іншым рамантызмам авеяна піяністычная творчасць Рудольфа Керара, якая здзіўляе мужнай сілай свайго таленту, дырыжорскім размахам выканання. Валявому, маштабнаму мысленню Керара блізкая стыхія Бетховена, Брамса, Ліста. Праноф'ева. У двух сваіх апошніх канцэртах ён выступіў як выдатны інтэрпрэтатар вялікай санаты Брамса фа-мінор і твораў кампазітараў-рамантыкаў — Шуберта, Ліста. Ігра Керара і віртуозная, і канцэртная ў лепшым сэнсе слова. Толькі віртуознасць гэта далёкая ад самалюбавання. Яна падпарадкавана шырокім мастацкім задумам, раскрывае творы ва ўсім іх буй-ным значэнні. Керар — і піяніст-зодчы, і піяніст-паэт. Яго раяль-аркестр санавіты багатым шматгалоссем, моцны магутнасцю басоў, якія выхоплівае радная па сіле левая рука, што стварае аснову гунавой архітэктуры. Слухач ахоплены таямніцай чаканння, нецярплівай прагай раскрыцця недасказанага, якое прыходзіць толькі з апошнім акордам.

Эстэтычнае значэнне выканаўчасці Керара вызначаецца спалучэннем у ім раскошы фарбаў «старога» рамантызму з бліскучай віртуозна-дынамічнай асновай сучаснага піянізму.

Вельмі блізні да гэтага злепак уражанняў прынеслі нам новыя сустрэчы з узмужнелым мастацтвам Вана Кліберна, аднаго з яркіх піяністаў-рамантыкаў сучаснасці. Таму тані і блізні ён нам, што ў сваёй сучаснай манеры (якая насыцілася проста-такі громападобнай ударнасцю і чэпкай «матэрыяльнасцю» гуну) ён застаецца верны лепшым традыцыям маштабна-канцэртнага, рахманінаўскага піянізму. Нядаўна ідзе ўсё больш углыб яго разліўная ў мінулым лірычная сфера выказвання, нядаўна «разлютоўваецца» яго «добры» ў мінулым драматызм. Кліберн непераймальны ў сваёй смелай імправізацыі, якая пакідае і новай выбуховай экспрэсіяй, і азёрамі сталых гунавых «аазісаў». Ён не іграе, а вымаўляе музыку, спандуруе кожную фразу, кожны гук. Усё бунна, усё значна, усё гранічна ясна ў яго прачытанні твораў, і толькі шчада, што іншы раз праслізгвае холад і «тверды» насцярпоі паверхні клавішаў, быццам размашыстае, сапрушальнае форта дасягае бар'ера дынаміні і, трацячы прыгажосць, задыхаецца ў праце перадоладзець «столь» магчымасцей фартэпіяна.

Майсняя—чэрвеньскія канцэрты адкрылі яшчэ адну неацэнную магчымасць фартэпіяна —яго на дзіва «ўжыўчывы» характар, які дае прастору для росквіту іншых клавішных інструментаў.

Глядзіце, як памаладзеў клавесін, адроджаны да новага жыцця дзякуючы намаганням кампазітара і клавесініста Андрэя Валконскага! Суседства бліскучых фартэпіённых вечароў ніколькі не зацьмявае прывабнасці яго канцэртаў, тым больш, што ў апошні час Валконскі прыцягнуў да ўдзелу ў іх вялікую групу маладых вакалістаў. На нашых вачах зараджаецца цэлы выканаўчы рух, мэтаю якога становіцца ўзнаўленне шэдэўраў перад-класічнай музычнай эпохі. Валконскі не памыліўся ў выбары партнёраў-спевакоў: усе яны валодаюць тонкай музычнасцю і арганічным адчуваннем «празрыстасці», лёгкасці стылю еўрапейскай музыкі XVI — XVII стагоддзяў. Усе яны на дзіва прыгожа ўзнаўляюць жывое шматгалоссе старадаўніх мініяцюр.

Абстаноўка канцэртаў новага ансамбля Андрэя Валконскага ўзнаўляе інтэр'ер еўрапейскіх салонаў эпохі Адраджэння з жывапісна расстаўленай, мудрагеліста інкруставанай мэбляю і залочанымі кандэлябрамі, з мяккім, «інтымным» асвятленнем, па-майстарску выкананым светлавымі афарміцелямі канцэртаў. Гэта маленькі імправізаваны спектакль, у час якога яго стваральнік і «рэжысёр» Валконскі то пераходзіць ад клавесіна да белага пульту органа, акампаніруючы спевакам і выконваючы сольныя нумары, то ўстае з-за інструмента і бярэцца дырыжыраваць, адраджаючы шматбаковае аблічча кіраўніка старадаўніх капэл. Каштоўнай рысай Валконскага-клавесініста з'яўляецца яго рэдкі па адточанасці рытмічны талент. Яго выкананне надае музыцы дынамічны, танцавальны, рытмічна вытанчаны характар.

Аднан дзесьці ў кадэрнізацыі клавесіннага стылю Валконскі траціць пачуццё меры і ўпадае ў напышлівую манернасць.

Ці ўдасца ўберагчыся Валконскаму-стылісту ад Валконскага-стылізатара? Ці ўдасца яму настроіць свой ансамбль на той сур'ёзны, патрабальны тон музыцыравання, які неабходны для сапраўды артыстычнага (а не толькі «асветніцкага») узнаўлення старадаўняй музыкі? Першыя шэсць канцэртаў новага таленавітага ансамбля, якія прайшлі з вялікім поспехам у Ленінградзе і Маскве, даюць спадзяванне на тое, што багатыя мастацкія перспектывы, якія адкрываюцца перад талентывам, будуць выкарыстаны яго кіраўніком і ўдзельнікамі з максімальным эфектам.

Тамара ГРУМ-ГРЖЫМАЙЛА,
музыказнаўца.
(АДН).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

25 чэрвеня

Першая праграма. 11.00 — «Іван Рыбакоў». Тэлевізійны спектакль. 16.30 — праграма перадач. 16.35 — тэлевізійныя навіны. Праграма Вільнюскай студыі тэлебачання. 16.55 — «Крылатая песня табе, мая Айчына!» 17.25 — «Дзецям дадзім сонца». 17.45 — спецыяльны выпуск тэлевізійных навін. 18.00 — «Дзень у Вільнюсе». Нарыс. 18.40 — «Нараджанне балета». 19.00 — «Зніні, песня Балгыкі». Фільм-канцэрт. 19.40 — «Кветкі ў форце смерці». Кінанарыс. 20.00 — канцэрт майстроў мастацтваў Літоўскай ССР. 20.40 — «Сартайская легенда». Спартыўная перадача. 20.50 — канцэрт эстраднай музыкі. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «З песняй праз гады». Перадача, прысвечаная 60-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Петруся Броўкі.

Другая праграма. 16.55 — праграма перадач (М). 17.00 — для школьнікаў. «Гном» (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.20 — экран вялікай хіміі (М). 19.00 — І. Шток. «Прызнанне ў нянавісці». Спектакль Цэнтральнага тэатра Савецкай Арміі (М). 21.30 — «Манрышская легенда». Кінанарыс. 22.00 — «Ці ведаеце вы кіно»? Кінавікторына. Заключны тур (М).

26 чэрвеня

Першая праграма. 11.00 — «Вялікі дэмакрат». Кароткаметражны фільм. 11.40 — «Старонкі опер і балетаў». Музычны фільм Свердлоўскай студыі тэлебачання. 14.55 — праграма перадач. 15.00 — для старэйшых школьнікаў. І. Лікстанаў. «Зялёны камень». Тэлевізійны спектакль (М). 17.00 — для малышоў. «Як самому зрабіць цацкі». 17.30 — праграма перадач. 17.35 — «Вялікая хімія Беларусі». Тэлевізійны часопіс. 18.15 — канцэрт эстраднага аркестра Беларускага радыё і тэлебачання. Песні і інструментальныя п'есы беларускіх кампазітараў. 18.55 — спартыўная перадача. 19.40 — тэлевізійныя навіны. 20.00 — «Да мяне, Мухтар!» Мастацкі фільм. 21.30 — тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — «На агеньчык». Перадача з Кішынёва.

Другая праграма. 17.00 — старонкі вашых пісьмаў (М). 18.00 — «Веды». Навукова-пазнавальная праграма (М). 19.00 — тэлевізійны клуб кінападарожжаў (М). 20.00 — В. Нізюрскі. «Нядзельная ўцёкі». Прэм'ера тэлевізійнага спектакля. Перадача з Кіева.

27 чэрвеня

Першая праграма. 10.25 — праграма перадач. 10.30 — для школьнікаў. «Дзеці партызана». Мастацкі фільм. Сёння Дзень савецкай моладзі. 14.15 — пачатак праграмы (М). 14.45 — для воінаў Савецкай Арміі і Флоту. «Пра доблесць, пра подзвіг!» (М). 15.15 — праграма перадач. 15.20 — «Гаспадары зямлі сваёй». Тэлевізійная перадача, прысвечаная Дню савецкай моладзі. 16.20 — «Фітиль». Сатырычны кіначасопіс. 16.30 — канцэрт-вальс. 17.00 — «Дачка стратыёна». Мастацкі фільм. 18.10 — маленькі канцэрт. 18.30 — «Святло і цені». Міжнародная праграма (М). 19.00 — спартыўная перадача (М). 20.45 — «Па загадзе сэрца». Выпускнікам сярэдняй школы (М). 21.00 — тэлевізійныя навіны (М). 21.30 — «Праспект маладосці». (М). 23.00 — «Табе, юнацтва!» (М).

Другая праграма. 10.30 — сёння Дзень савецкай моладзі (М). 10.40 — «На прасторах Радзімы (М). 10.50 — «Здароўе» (М). 11.30 — «Гуцульскія ўмельцы». Перадача з Львова. 15.15 — музычны кіёск (М). 15.45 — акно сатыры (М). 16.00 — «Кінаэкран — 1965». Насустрач IV Міжнароднаму кінафестывалю ў Маскве (М). 17.00 — А. Бруштайн. «Унукі». Тэлевізійны спектакль (М). 18.30 — «Раймонда». Фільм-балет. 19.55 — «Манета». Мастацкі фільм.

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ